Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагароднія	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок найпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок найпарэлі насьпрод тэксту 1 р. — к.
За радок найпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй.
Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыя ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 286 (2178) Субота, 17-га сьнежня 1927 г.

Закасаўшы рукавы.

«Усе члены партыі уся рабочая кляса, усе працоўныя Рэспублікі Саветаў чакаюць ад XV зьезду такіх умоў, пры якіх партыя, закасаўшы рукавы, магла-б працаваць са ўсёй сваёй магутнасьцю над вырашэньнем тых вялізарных пытаньняў, якія перад ёю стаяць», сказаў тав. Рыкаў, адчыняючы зьезд

Зьезд апраўдаў гэтыя надзеі.

Ухваліўшы рэзалюцыі па справаздачы ЦК і скончыўшы з апазіцыяй рашуча і беззваротна, далей зьезд пачынае падыйшоў да пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва.

Даклады т. т. Арджанікідзэ, Рыкава і Куйбышаўскага і разгорнутыя па іх спрэчкі бязьшчадна выкрылі ўсе гнайнікі нашага дзяржаўнага апарату, усе балячкі капітальнага будаўніцтва і савецкай гаспадаркі.

Зьезд даказаў, што бальшавіцкая партыя не баіцца самай лютай самакрытыкі, але рашуча адмятае ў бок усіх малавераў, якія сеюць паніку і перапкаджаюць барацьбе з працы.

Усе недахопы ў нашай працы, усе перашкоды на цяжкім шляху могуць быць пераможаны пры ўмове мабілізацыі навакол гэтых праблем шырокіх мас рабочых і сялян.

Вярхі дзяржаўнага апарату з бегам часу могуць заражацца рутынай і кансэрватызмам. Уліўшы ў савецкі апарат новыя дзесяткі і сотні тысяч працаўнікоў, дапусьціўшы да працы ўсіх жадаючых браць удзел у той ці іншай галіне савецкага кіраўніцтва, даўшы нашым установам практыкантаў [і намоцнікаў,—мы гэтым самым ужывём сапраўдныя меры барацьбы з бюракратызмам.

Мы намецілі на бліжэйшыя пяць гадоў укладаньне ў капітальнае будаўніцтва 20 міліярдаў рублёў. Да гатай пары мы вельмі заклапочаны былі—дзе ўзяць сродкі на будаўніцтва. Куды і як выдаваць грошы, што будаваць у першую чаргу, які тып машын выбраць,—гэтыя пытаньні пакуль што былі ў цяні.

І таму будаўніцтва часта праводзілася нерацыянальна і дорага. Выбіраліся старыя формы арганізацыі вытворчасьці, былі хібы ў пытаньнях аздараўленьня ўмоў працы.

Выпрацоўка пяцігодкі дасьць генэральную наместку ў гэтых пытаньнях. Але канкрэтныя адказы на шэрагу пытаньняў, якія стаяць перад намі, магчыма будзе даць толькі ў працэсе шырокіх дыскусій па пытаньнях рацыяналізацыі, плянаваньня, капітальнага будаўніцтва.

І ня толькі з пункту гледжаньня эканаміста або статыстыка павінны весьціся гэткія абмеркаваньні. Інжынэр, майстар, доктар, аграном павінны зрабіцца сталымі, пажаданымі ўдзельнікамі нашых сходаў, зьездаў, газэт, часопісяў.

У абсьледваньнях РСІ таксама павінны браць удзел шырокія масы перад абсьледваньнем. Рабочыя сходы павінны абмеркаваць плян яго і выдзеліць сваіх прадстаўнікоў для ўдзелу ў абсьледваньні.

Роля прадстаўніка РСІ будзе ў інструктаваньі і накіраваньні працы выдзеленых рабочых. Абсьледваньне-ж могуць з посьпехам праводзіць працаўнікі зацікаўленых прадпрыёмстваў.

Больш увагі належыць надаваць пытаньням вылучэньня.

Тав. Касіёр у сваім дакладзе адзначыў ужо, што толькі мэталісты і гарнякі шырока разгарнулі гэтую працу. У рэшты саюзаў праца на вылучэньню была пастаўлена слаба. У выніку гэткіх няўважлівых адносін прафарганізацыі да гэтай праблемы, як гэта падрабязна апавядаў т. Сталін, адбываецца «залучэньне» вылучэнца; з прычыны нядбайных і бюракратычных адносін прафэсыянальных працаўнікоў і гаспадарнікаў вылучэнец расчароўваецца ў сваёй працы, і ідэя вылучэньства кампрамэтуецца ў вачох рабочых. Мы павінны «калёным жалезам выпальваць гэткія агідныя справы ў нашай практыцы».

Зразумела, ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыёмстваў вымагае іх канкрэтызацыі і спэцыяльных зазначэньняў РСІ і прафсаюзаў. Але вядома адно—праз масавыя абсьледваньні РСІ, праз шырокія дыскусіі па практычных пытаньнях нашага будаўніцтва, праз дабраахвотнае практыканцва і вылучэньства да справы сацыялістычнага будаўніцтва будуць прыцягнуты яшчэ некалькі дзесяткаў і сотняў тысяч пралетарыяў.

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыёмстваў ні ў якой меры не паслабіць асноўнай працы прафсаюзаў, вытворчых парад, кантрольных камісій, а наадварот—дапаможа ім у справе ўцягваньня ў грамадзкую працу новых кадраў членаў прафсаюзаў.

Толькі шырока разгорнутым фронтам пад кіраўніцтвам партыі мы ажыцьцёвім задачы, намечаныя XV зьездам: стварэньне таннага, выразна-працуючага і шчыльна зьвязанага з масамі савецкага апарату і індустрыялізацыя нашай краіны.

Нажым арбітражнае інстанцыі на нямецкіх мэталістаў.

2 АБАВЯЗКОВЫХ ПАСТАНОВЫ ТРАЦЕЙСКАЕ КАМЕРЫ.

БЭРЛІН, 15-12. Трацейская камера, якая разглядала канфлікт між прадпрыёмцамі і рабочымі жалезаробнае прамысловасьці, ухваліла дзьве трацейскія пастановы. Першая пастанова—на пытаньні аб даўжыні працоўнага дню падрабязна вызначае даўжыню рабочага часу ў розных галінах жалезаробнае прамысловасьці, прычым, або непасрэдна ўстанаўляе больш чым 8-гадзінны працоўны дзень, або—у тых выпадках, дзе справа ідзе аб увядзеньні трохзьменнае працы—скарачае на адведны лік гадзін даўжыню штотыднёвага нядзельнага адпачынку.

Другая трацейская пастанова датычыць устанаўленьня разьмераў заработку. У гэтай пастанове зазначаецца, што з часу апошняга павялічэньня заработку агульная дарагоўля ўзрасла нібы на 3 проц.

«Усё-ж такі прафэсыянальныя саюзы,—зазначана ў пастанове,—прызнаюць няспрыяючае фінансавае становішча апрацоўчае прамысловасьці, для якое ўтрыманьне замежнага рынку патрабуе выдаткаў і якая мае на ўнутраным рынку надзвычайна малы прыбытак. Рабочыя, замест выгады, якую маюць ад скарачэньня працоўнага часу, павінны прынамсі часова ўзяць на сябе зьменшаньне заработку. З гэтае прычыны павялічэньне заработку на 2 проц. здаецца справядлівым («прафэсыянальныя саюзы патрабавалі павялічыць заработак прыблізна на 13 пр.)

Першая трацейская пастанова ня можа быць скасавана да студзеня 1928 г., а другая—да кастрычніка 1928 г. Пасьля гэтага часу кожны з бакоў можа за месяц папярэдзіць аб адмове ад адведнае пастановы. Абодвы бакі павінны заявіць аб сваіх адносінах да абодвых трацейскіх пастаноў да 19-га сьнежня.

У АБАРОНУ НЯМЕЦКІХ МЭТАЛІСТАЎ.

Адозва міжнародных к-таў прапаганды мэталістаў, гарнякоў і транспартнікаў.

МАСКВА, 16-XII. Міжнародныя камітэты прапаганды рэвалюцыйных мэталістаў, гарнякоў і транспартнікаў зьвярнуліся да рабочых усіх краёў з адозвай наконт пагрозы лёкауту ў нямецкай мэталёвай прамысловасьці.

„Трыста тысяч мэталістаў нямецкае па вырабу жалеза прамысловасьці,—гаворыцца ў адозьве,—знаходзяцца пад пагрозаю лёкауту, які рыхтуюць магнаты нямецкага сталёвага трэсту ў адказ на патрабаваньні нямецкіх мэталістаў аднавіць 8-мігадзінны рабочы дзень, адабраны „часова" яшчэ ў 1923 годзе. Сталёвы трэст Намеччыны, які зьяўляецца найбольш буйным членам міжнароднага сталёвага трэсту, арганізаваны яшчэ год назад і пасьпеўшы за кароткі пэрыяд свайго існаваньня нажыць вялізныя прыбыткі на бязьлітасным эксплёатацыі нямецкіх рабочых, пастанавіў ужыць у сучасны момант усю магутнасьць створанага ім апарату для ўтрыманьня сваіх прыбыткаў і замацаваньня павялічанага, стамляючага рабочага дню мэталістам на шмат гадоў.

Яшчэ ў ліпені 1927 г. нямецкі міністр працы, пад нажымам рабочых, выдаў пастанову аб увядзеньні 8-мігадзіннага рабочага дню з 1-га студзеня 1928 г. Але закон напісан не для магнатаў мэталюргіі. Яны ня хочуць нават ужыць прымусовы арбітраж свайго ўласнага ўраду і заяўляюць, што зачыняюць заводы па меркаваньнях эканамічнае выгады. На справе зачыненьне заводаў гэта толькі маневр для прыкрыцьця лёкауту проці 8-мігадзіннага рабочага дню.

Рабочыя мэталісты Намеччыны павінны быць гатовы да рашучае барацьбы пры падтрыманьні пралетарыяту Нямеччыны і іншых краёў, а асабліва гарнякоў і транспартнікаў.

Прадпрыёмцы разьлічваюць на згодніцкую палітыку рэфарміцкіх лідэраў прафруху Нямеччыны. Рабочыя мэталісты Нямеччыны, Францыі, Бэльгіі і іншых краёў павінны быць на варце і пільна сачыць за сваімі лідэрамі, не забываючы прыкладаў надаўняе барацьбы рабочых у Англіі. На пагрозу лёкауту, на зачыненьне заводаў і звальненьне рабочых, усе рабочыя мэталісты павінны адказаць усеагульнаю забастоўкаю на ўсім фронце мэталёвае прамысловасьці Нямеччыны. Рабочыя іншых галін прамысловасьці павінны падтрымаць іх стачкаю салідарнасьці.

Толькі такі адказ можа паскорыць пасьпешнае вырашэньне пытаньня аб 8-мігадзінным рабочым дні. Неабходна неадкладная мабілізацыя ўсіх рабочых мэталістаў, гарнякоў і транспартнікаў. Неабходна заснаваньне базавога альянсу саюзаў рабочых гэтых асноўных галін прамысловасьці. Барацьба мэталістаў у Нямеччыне—гэта барацьба мэталістаў усіх краёў, уваходзячых у сталёвы трэст. Калі пераможа капітал у Нямеччыне, дык няўхільна адбудзецца павялічэньне рабочага дню ва ўсіх краёх.

Рабочыя мэталісты, транспартнікі і гарнякі ўсіх краёў не павінны дапусьціць штрэйкбрэхерства.

Ні аднае тоны штрэйкбрэхерскага мэталю, чыгуну, сталі і вугалю.

Усе на баявое падтрыманьне нямецкіх мэталістаў".

Арышт чэхаславацкае сялянская дэлегацыі.

ПРАГА. Чэхаславацкая сялянская дэлегацыя, якая вярнулася з СССР, была арыштавана чэхаславацкаю ўладаю ва пагранічнай станцыі Пятровіцы і перавезена ў астроўскае палітэйскае кіраўніцтва і вызвалена толькі пасьля ўмяшаньня астроўскіх камуністычных дэпутатаў.

Прычыны арышту ня былі паведамлены дэлегатам.

XV ЗЬЕЗД УсеКП(б).

Рэзалюцыя па справаздачы ЦКК—РСІ.

Ухвалена аднагалосна.

ПАШЫРЫЦЬ ФРОНТ БАРАЦЬБЫ З БЮРАКРАТЫЗМАМ І ЗАГАНАМІ АПАРАТУ ПРАЗ БОЛЬШАЕ ЎЦЯГНЕНЬНЕ Ў СПРАВУ КІРАЎНІЦТВА ПРАЦОЎНЫХ ГУШЧАЎ. УЗМАЦНІЦЬ МЕРЫ СУДОВА-АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА УЗЬДЗЕЙНІЧАНЬНЯ ПРОЦІ БЮРАКРАТАЎ, „НЕ ЗВАЖАЮЧЫ НА АСОБЫ".

Зьезд поўнасьцю ўхваляе працу ЦКК—РСІ.

XV зьезд ухваляе цалкам і поўнасьцю працу ЦКК—РСІ як у галіне заховы адзінства і дысцыпліны ў партыі, так і ў галіне палепшаньня дзяржаўнага апарату і барацьбы з яго бюракратычнымі заганамі.

Зьезд са здаволеньнем адзначае, што ў самых цяжкіх умовах нячуванае ў партыі раскольніцкае дзейнасьці троцкісцка-меншавіцкае апазіцыі ЦКК з посьпехам выпаўняла заветы Ільліча аб захаваньні адзінства бальшавіцкае партыі.

Зьезд цалкам ухваляе захады, ужытыя Цэнтральнай Кантрольнай Камісіяй проці парушыцеляў адзінства, арганізатараў фракцыйнае барацьбы проці партыі і руйнавацеляў яе дысцыпліны. Згуртоўваючы рады партыі і павялічваючы яе здольнасьць выконваць асноўныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва, ЦКК з посьпехам змагалася з элемэнтамі распаду ў партыі і са злоўжываньнем сваім становішчам з боку асобных камуністаў, якія займаюць адказныя пасады.

Зьезд цалкам ухваляе працу ЦКК у галіне барацьбы з парушэньнямі ўнутрыпартыйнае дэмакратыі, з элемэнтамі бюрократызму ў партыі і прапануе ЦКК гэтую працу ў далейшым узмацніць.

Зьезд са здаволеньнем адзначае, што ЦКК—РСІ за справаздачны пэрыяд завастрылі ўвагу ўсёй партыі і павялі энэргічную барацьбу проці бюракратызму, за палепшаньне і патаненьне дзяржаўнага апарату, прыцягваючы да гэтае справы шырокія рабочыя і сялянскія масы. У адпаведнасьці з гэтым дасягнуты першыя посьпехі ў галіне барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі і ў адносінах палепшаньня дзяржаўнага апарату: посьпехі ў правядзеньні рэжыму эканоміі, некаторае спрашчэньне і скарачэньне апарату, скарачэньне справаздачнасьці, скарачэньне непатрэбных выдаткаў і г. д.

Лічачы, што дасягнутыя посьпехі і вопыт працы РСІ даказваюць, што партыя і пралетарыят маюць вялізныя магчымасьці для далейшага разгортваньня барацьбы проці бюракратычных скажэньняў нашага апарату, зьезд прапануе ЦКК—РСІ кіравацца ў далейшай працы палепшаньня апарату такімі зазначэньнямі:

1. Будуючы сваю працу на аснове ўцягненьня шырокіх рабочых і наогул працоўных мас у справу палепшаньня савецкага апарату і барацьбы з бюракратызмам, Рабоча-Сялянская Інспэкцыя павінна быць арганізатарам рабочых і сялян, якія правяраюць працу савецкага апарату.

Праца павінна праводзіцца праз і супольна з існуючымі арганізацыямі рабочых і сялян, а іменна: прафсаюзнымі арганізацыямі, вытворчымі парадамі, кантрольнымі камісіямі прадпрыёмстваў, фабкомамі, мясцкомамі, эканомкамісіямі, сэкцыямі саветаў, делегацкімі сходамі работніц і сялянак і і інш. РСІ павінна ўцягваць рабочых ва ўсе стадыі сваёй працы, выносячы вынікі працы на абмеркаваньне агульна-гарадзкіх сходаў, адчыненых сходаў ячэек, клюбных сходаў і г. д. Праверку выкананьня савецкімі органамі дырэктыў партыі і ўраду РСІ павінна праводзіць сіламі рабочых, якія абіраюцца заводзкімі сходамі і толькі інструктуюцца і маюць на чале працаўнікоў Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі. Пры гэтым РСІ павінна грунтавацца на зазначэньнях Леніна: «Калі мы хочам змагацца з бюракратызмам, дык мы павінны прыцягнуць да гэтага нізы». (Ленін, том XVIII, частка 2, стар. 189). «Якім-жа інакшым спосабам можна спыніць бюракратызм, як не прыцягненьнем рабочых і сялян?...» (там-жа стар. 188).

2. Адным з галоўных мэтадаў перабудовы дзяржаўнага апарату зьяўляецца ажыўленьне і ўзмацненьне саветаў. Дасягнутыя ў гэтай галіне посьпехі вызначаюць толькі пачатак гістарычнае паласы, задачаю якое зьяўляецца паступовае ўцягваньне ўсяго працоўнага жыхарства ў працу па кіраваньні дзяржаваю і тым самым поўную перамогу над бюракратызмам. Задачаю ЦКК—РСІ зьяўляецца сыстэматычная праверка ходу працы па ажыўленьні саветаў з мэтаю выявіць і адхіліць перашкоды да яго ажыцьцяўленьня, узмацніць працу па праверцы ажыцьцяўленьня рабочае савецкае і партыйнае дэмакратыі, няўхільна адхіляючы ўсе перашкоды да ажыцьцяўленьня і караючы вінаватых у яе парушэньні. Трэба правяраць ажыцьцяўленьне сапраўднае выбарнасьці, права водкліку дэпутатаў, вылучэньне рабочых і работніц на кіруючую працу, ступень ажыцьцяўленьня нізавымі грамадзкімі арганізацыямі рабочых і сялян прысвоенных ім савецкімі законамі правоў і абавязкаў і г. д. Асаблівую ўвагу пры гэтым зьвярнуць на вылучэньне рабочых і работніц у адміністрацыйны, прамысловы, гандлёвы і каапэрацыйны апарат, няўхільна змагаючыся з бюракратычнымі адносінамі да гэтага ўцягненьня і дамагаючыся новых посьпехаў у справе сапраўднага арабочваньня савецкага апарату.

3. Няўхільна вывучаць і выяўляць скажэньні, якія нараджаюцца дзякуючы нажыму варожых пралетарыяту сіл на тыя ці іншыя зьвеньні дзяржаўнага апарату, асабліва ў тых частках апарату і ў тых галінах кіраўніцтва, у якіх гэтыя скажэньні могуць выяўляцца з асаблівае сілаю (крэдыт, ахова працы, каапэрацыя і інш.).

4. Няўхільна праводзіць далей працу над патаненьнем і спрашчэньнем адміністрацыйнага, гандлёвага, каапэрацыйнага і прамысловага апарату за рэжым эканоміі і між іншым давесьці да канца ва ўсіх без выключэньня зьвеньнях кіраўніцтва і гаспадарні скарачэньне адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў у 1927-28 г. ня менш, чымся на 20 проц., сурова правяраючы фактычнае яго ажыцьцяўленьне.

5. Наладзіць працу па праверцы ходу рацыяналізацыі як у галіне кіраўнічага апарату, так і ў галіне прамысловасьці і гандлёвага апарату. Спэцыяльна зьвярнуць увагу на праверку ходу рацыяналізатарскае працы ў галіне прамысловасьці з таго пункту гледжаньня, каб было дасягнута скарачэньне зьніжэньне сабекошту прадукцыі, палепшаньне ўмоў працы, правільнае выкарыстаньне працы рабочых і спэцыялістаў, усваеньне лепшых узораў эўрапейскае і амэрыканскае тэхнікі і ўсюдышнае выкарыстаньне ўжо існуючых у нас дасягненьняў і ўзораў палепшанае працы.

6. Правяраць правільнасьць выкарыстаньня ў нас навукова-тэхнічных сіл, паколькі посьпешнае правядзеньне рацыяналізацыі магчыма толькі пры шырокім прыцягненьні і правільным выкарыстаньні навукова-тэхнічных сіл як нашых, так і чужаземных.

7. Разгарнуць і паглыбіць у далейшым працу па праверцы капітальнага рамонту і новага будаўніцва дзеля яго патаненьня, бясспрэчнага зьнішчэньня лішніх накладных выдаткаў і ўсваеньня дасягненьняў перадовае тэхнікі капіталістычных краёў.

8. Праводзіць далей працу над стварэньнем вучоту і выпрацоўкі справаздачнасьці кароткае, таннае, выразнае, дакладна адпавядаючае задачам плянаваньня і кіраваньня. У асобку, пашырыць вопыт мэханізацыі канторскае і рахунковае справы.

9. Яшчэ больш узмацніць барацьбу з нашымі арганізацыйнымі недахопамі, з валакітаю, безгаспадарчасьцю, разбэшчанасьцю і дамагацца далейшага павялічэньня адказнасьці выканаўцаў, устанаўленьня дакладнага разьмежаваньня функцый, скасаваньня раўналегласьці і г. д.

10. Няўхільна караць усімі мерамі, да аддачы пад суд, служачых дзяржаўнага апарату (як камуністаў, так і беспартыйных), вінаватых у недалікатных, панскіх, пагардных адносінах да наведваючых установы грамадзян. Выяўленьне няўважлівасьці да рабочага ці селяніна з боку любога служачага адміністрацыйнага, гандлёвага, каапэрацыйнага і прамысловага апарату павінна разглядацца, як сабатаж і злачынства проці савецкае ўлады.

11. Узмацніць, водлуг неаднаразовых зазначэньняў Леніна і ленінскае партыі, праверку выкананьня савецкіх законаў, забясьпечыўшы пры дапамозе рабочых і сялян масавую праверку ажыцьцяўленьня ўсіх галоўных мерапрыёмстваў ураду і ўстанавіўшы самую суровую адказнасьць асоб і ўстаноў, вінаватых у затрыманьні і невыкананьні законаў ураду. Узмацніць праверку правядзеньня камуністамі, якія працуюць у дзяржаўным апараце і грамадзкіх арганізацыях, дырэктыў партыі. Між іншым, наладзіць сыстэматычную праверку практыкі нацыянальнае палітыкі ў нацыянальных рэспубліках і абласьцёх.

12. Выпрацаваць і забясьпечыць правядзеньне ў жыцьцё мер найбольш суровага ўзыску ў адносінах да тых працаўнікоў дзяржаўнага апарату, як партыйных, так і беспартыйных, якія паспрабуюць проціпаставіць працы партыі над зьнішчэньнем бюракратычных скажэньняў сваё рутынёрства, забабонасьць, чыноўнічае самаздаволеньне, якое прыбівае нярэдка нажым варожых пралетарыяту клясаў. У гэтай барацьбе за палепшаньне дзяржаўнага апарату павінны браць самы актыўны ўдзел усе камуністы, працуючыя ў адміністрацыйным, гаспадарным і гандлёвым апараце. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі савецкіх устаноў сваёй паступовай працаю павінны дапамагаць органам ЦКК-РСІ ў іх складанай і цяжкай працы па перабудове дзяржаўнага апарату ў духу ўмацаваньня яго сувязі з шырокімі масамі.

13. Зьезд даручае ўсім партыйным арганізацыям ужыць меры да палепшаньня працы друку, шырока выкарыстоўваючы рабселькораўскі рух у галіне барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі. Выкрываючая праца друку павінна весьціся водлуг прынцыпу поўнага выяўленьня ўсіх балячак нашага дзяржаўнага апарату і бязьлітаснае крытыкі, «не зважаючы на асоб» (Ленін).

14. Зьезд даручае ўсім партыйным арганізацыям забясьпечыць палепшаньне і пашырэньне працы органаў суду ў галіне барацьбы з бюракратызмам, няўхільна прыцягваючы да народнага суду працаўнікоў адміністрацыйнага і гаспадарчага апарату вінаватых у злачыннай безгаспадарнасьці, у чыноўнічых адносінах да справы, не дапушчаючы пры гэтым ніякіх палёгак па прысудах ці спыненьня судовага сьледзтва ў моц рабоча-сялянскага паходжаньня, ранейшых выслуг, сувязяў і інш. У мэтах зьнішчэньня якіх-бы там ні было прывілеяў для працаўнікоў дзяржаўнага апарату, ліквідаваць дысцыплінарны суд і ўстанавіць падсуднасьць працаўнікоў дзяржаўнага апарату агульна-цывільнаму суду.

15. Лічачы прафэсыянальныя саюзы адным з галоўных арганізатараў масавае барацьбы з бюракратызмам, зьезд зварочвае ўвагу фракцый УЦСПС і ўсіх прафэсыянальных саюзаў на неабходнасьць усямерна ўзмацняць удзел прафсаюзаў ва ўсёй справе барацьбы з бюракратычнымі скажэньнямі савецкага апарату. Прафэсыянальныя саюзы павінны арганізаваць справу масавага падтрыманьня рабоча-сялянскае інспэкцыі ў яе барацьбе за палепшаньне дзяржаўнага апарату. Гэтая праца прафэсыянальных саюзаў павінна грунтавацца на самадзейнасьці і актыўнасьці ўсяе сыстэмы прафэсыянальных арганізацый, пачынаючы з іх заводзкіх нізавых ячэек. Між іншым, прафэсыянальныя саюзы павінны ўзяць на сябе выяўленьне кожнага канкрэтнага выпадку бюракратызму, прасьледаваньне кожнага выяўленага выпадку бюракратызму ўсімі мерамі, прадугледжанымі законамі пралетарскае дзяржавы, пачынаючы ад грамадзкае ганьбы і канчаючы прыцягненьнем вінаватых да суду непасрэдна, ці праз органы РСІ.

16) Зьезд зьвяртае асаблівую ўвагу на неабходнасьць палепшаньня працы саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, адным з асноўных абавязкаў якога зьяўляецца грамадзкае выхаваньне працаўнікоў дзяржаўнага апарату ў духу барацьбы з бюракратызмам, у духу адданасьці справе сацыялістычнага будаўніцтва.

17) Аднаго толькі васнаваньня таннага і выразна працуючага апарату для нас мала. Трэба будаваць тэхніку кіраўніцтва так, каб палепшаньне гэтае тэхнікі дапамагала вырашэньню асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія стаяць перад намі, і падрыхтоўцы ўмоў поўнага адміраньня дзяржавы. Палепшаньне тэхнікі кіраўніцтва зьяўляецца ня толькі сродкам патаненьня апарату, але і спосабам спрашчэньня справы кіраўніцтва, што ня можа не палегчыць уцягненьня новых гушчаў мілённых мас працоўных у справу кіраваньня краем. Гэтую сувязь і залежнасьць між задачаю палепшаньня тэхнікі кіраўніцтва і задачаю разьвіцьця пралетарскае дэмакратыі зьезд асабліва падкрэсьлівае, паколькі барацьба за палепшаньне тэхнікі кіраўніцтва, за ўсваеньне нашым апаратам заваёў культуры ня толькі не павінна весьці да яго самазамыканьня, да яго адрыву ад мас, але, наадварот, павінна стварыць умовы спрыяючыя і палягчаючыя ўцягненьне народных мас у справу кіраўніцтва.

18) Апазіцыя ў пытаньні аб бюракратызьме коціцца да адхіленьня пралетарскага характару нашае дзяржавы, да адхіленьня ленінскае пастаноўкі пытаньня аб нашым апараце, яго хваробах і мэтадах яго лячэньня. Каранная памылка апазіцыі, гэта—неразуменьне таго, што наш дзяржаўны апарат, не зважаючы на ўсе яго недахопы і бюракратычныя скажэньні, не зважаючы на яго сучасную надмерную дарагоўлю, зьяўляецца вышэйшым тыпам кіраўніцтва ў параўнаньні з буржуазнай дэмакратыяй, як апарат кіраўніцтва новае пануючае клясы—рабочае клясы, якая ажыцьцяўляе сваю ўладу ў саюзе з сялянствам. Апазіцыя ў гэтым пытаньні, як і ў іншых пытаньнях, пакідае бачыць розьніцу між становішам у нас і ў буржуазеі. Яна ня бачыць таго, што бюракратызм у буржуазнай грамадзе, як выяўленьне клясавага панаваньня капіталістаў, можа быць зьліквідаваны толькі разам з зьнішчэньнем дзяржаўнага апарату буржуазеі, а ў нашай дзяржаве бюракратызм, які часткова адрадзіўся і існуе наперакор клясавай прыродзе савецкае дзяржавы, як вынік эканамічнае і культурнае адсталасьці, можа быць зьліквідаваны праз умацаваньне нашае дзяржавы і ўздыму яе на вышэйшую ступень культуры.

19) Зьезд лічыць, што разьвіцьцё пралетарскае дэмакратыі, ажыўленьне і ўзмацненьне саветаў, уцягненьне новых сотняў тысяч рабочых і сялян у справу кіраваньня дзяржаваю, урэшце, уздым культурнага ўзроўню рабочых і наогул працоўных мас ёсьць асноўная ўмова пасьпешнасьці нашае барацьбы з бюракратызмам і палепшаньня нашага дзяржаўнага апарату. Адпаведна з гэтым галоўным мэтадам барацьбы з бюракратызмам у нашым краі зьяўляецца далейшае правядзеньне ў жыцьцё мер, паказаных у партыйнай праграме:

„Вядучы самую рашучую барацьбу з бюракратызмам, РСІ адстойвае для поўнае перамогі гэтага зла наступныя меры: 1) абавязковае прыцягненьне кожнага члена савету да выкананьня пэўнае працы па кіраўніцтве дзяржаваю; 2) паступовую зьмену гэтае працы з тым, каб яна паступова ахапляла ўсе галіны кіраўніцтва; 3) паступовае ўцягненьне ўсяго працоўнага жыхарства пагалоўна ў працу па кіраваньні дзяржаваю. Поўнае і ўсебаковае правядзеньне ўсіх гэтых мер, уяўляючы сабою далейшы крок па шляху, на які ўзышла Парыская Камуна, і спрашчэньне функцый кіраўніцтва пры ўздыме культурнага ўзроўню працоўных вядуць да зьнішчэньня дзяржаўнае ўлады„. („8-мы зьезд УсеКП(б) у рэзалюцыях", стар. 174-175).

За дзень.

Кітайскі фашызм.

Чан-Кай-шы зноў вярнуўся да ўлады. Яго зварот да ўлады быў адзначан загадам аб ліквідацыі савецкіх консульстваў у Кітаі і аб спыненьні зносін з СССР.

Па ўкоснаму загаду ангельскага імпэрыялізму кітайскі фашызм у асобе Чан-Кай-шы зноў узьняў галаву. Рэвалюцыйны рух, які не паказвае ніякіх адзнак зьмяншэньня тэмпу разьвіцьця і апошнія паўстаньні ў Кантоне і Чанша далі новы повад для разьюшанай агітацыі супроць СССР. Увесь імпэрыялістычны друк у Кітаі і Эўропе апошняе паўстаньне адносіць на кошт дзейнасьці савецкіх консульстваў у Кітаі. Ван-Цзін-Вэй, які зусім некалькі дзён таму таксама выступаў супроць нанкінскага ўраду і супроць гуандуньскіх генэралаў, зараз перад пагрозай рабоча-сялянскай рэвалюцыі таксама цалкам перайшоў у лягер контр-рэвалюцыі.

Кітайскі фашызм усё больш выказвае адзнакі наступаючага характару. Кітайскі фашызм паставіў сабе мэтай выкарыстаць усе магчымасьці, якія ёсьць у яго распараджэньні, як легальнага, так і нелегальнага характару, для барацьбы з рабоча-сялянскімі масамі. Правадыры кітайскай рэакцыі разумеюць, што чырвоны сьцяг над савецкімі консульствамі ў Кітаі ня можа ня клікаць працоўныя масы на паўстаньні, на барацьбу з контр-рэвалюцыяю.

Вось чаму поруч і нават першачарговым захадам для барацьбы з рэвалюцыяй кітайскі фашызм высунуў лёзунг барацьбы з савецкімі консульствамі ў Кітаі. Кітайская рэакцыя разумее ўсю беспадстаўнасьць і бяссэнсоўнасьць абвінавачваньня консульства СССР ва ўдзеле ў паўстаньні, але для таго, каб паказаць імпэрыялістам, што яны шчыра і сумленна хочуць змагацца з рэвалюцыяй, ім таксама неабходна барацьба за выгнаньне савецкіх консульстваў з Кітаю. Гэтым і тлумачыцца заява Чан-Кай-шы, у якой ён казаў, што: «неабходна нарваць дыпляматычныя дачыненьні з СССР і адновіць іх пасьля посьпеху нашай справы ў Кітаі».

Чан-Кай-шы, які зараз стаў на чале кітайскага фашызму, добра ўяўляе сабе каштоўнасьць той дапамогі, якую яму аказвае зараз ангельскі імпэрыялізм. Ён ведае, што ангельскі імпэрыялізм ніколі ня дасьць магчымасьці Кітаю самастойна будаваць сваю дзяржаву, але для барацьбы з рэвалюцыяй ён бяз гэтае дапамогі абыйсьціся ня можа. Таму яго лёзунгам зьяўляецца толькі часовае спыненьне зносін з СССР.

Рабочыя і сялянскія масы Кітаю ўжо ацанілі дзейнасьць Чан-Кай-шы. Хваля забастовак і паўстаньняў была лепшым адказам на мерапрыёмствы Чан-Кай-шы.

Як ня трэба вырашаць справы.

«Вырашэньне» Лігай Нацый шматгадовай вострай спрэчкі між Літвою і Польшчаю аб тэрыторыях, якімі цяпер фактычна карыстаецца Польшча, і зьліквідаваньне так званага становішча вайны між гэтымі дзяржавамі—вось галоўныя тэмы дня і польскіх і літоўскіх газэт. Пры гэтым кожная старана расцэньвае вынікі сэсіі Лігі Нацый пасвойму. Польскія газэты, асабліва тыя, якія адносяцца да ўраду Пілсудзкага без асаблівай няпрыязьні, імкнуцца прадставіць новую ўтварыўшуюся сітуацыю, як перамогу Польшчы, бо яна дабілася зьліквідаваньня становішча войны і не дапусьціла пастаноўкі пытаньня аб перагляднзе польска-літоўскіх межаў, а гэтым самым як-бы зьняла з парадку дню пытаньне аб аддачы Вільні Літве.

Літоўскія газэты ў сваёй большасьці лічаць вынікі сэсіі Лігі Нацый ня шкоднымі для сябе, хоць яны і ня прынесьлі Літве канчатковай перамогі ў яе барацьбе за зварот адабраных ад яе Польшчаю тэрыторый. Літва, па думцы гэтых газэт, дабілася на гэты раз загарантаваньня Лігай Нацый яе незалежнасьці і сучаснай тэрыторыі ад пагроз з боку Польшчы. Апрача таго, Літва дабілася некаторых посьпехаў у больш дробных справах.

Выходзіць так, што абедзьве старны зьелі вельмі прыемную чакалядку і наперабой хвастаюцца перамогаю, даходзячы ў сваіх хвасьлівых выкліках да дзяцінства.

Польшча блэзумоўна чакала ад Лігі Нацый моцнага падтрыманьня сваіх агрэсыўных намераў адносна Літвы. Хітрымі і вельмі рызыкоўнымі дэманстрацыямі, якія мелі ў апошнія часы месца ў Вільні і ў Варшаве, Польшча хацела націснуць на Лігу Нацый, каб тая ці адмовілася залагодзіць польска-літоўскую спрэчку і гэтым разьвязала-б рукі Польшчы, ці вырашыла-б яе ў сэнсе падпарадкаваньня тэрыторыі Літвы сувэрэнітэту Польшчы.

Спроба ня ўдалася... Польшча атрымала па пальцах...

Літва, калі і не дабілася канчатковых сваіх мэтаў, дык і

XV зьезд УсеКП(б).

Спрэчкі па дакладах т.т. Рыкава і Кржыжаноўскага.

(На ранішнім пасяджэньні 15 сьнежня).

КАЛАЦІЛАЎ (Іванава-Вазьнясенск) зварочвае ўвагу на патрэбы тэкстыльнае прамысловасьці, якія не зваймілі патрэбнага адбіцьця ў пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі. Галоўнаю бядою для тэкстыльных райёнаў прамоўца лічыць нездавальняючую дастаўку гэтым райёнам хлеба. Потым Калаціла́ў знаходзіць, што пункты пяцігодак аддаюць мала ўвагі разьвіцьцю лёгкае індустрыі.

САКОЛЬНІКАЎ зазначае, што канчатковае складаньне пяцігадовага пляну скончыцца не раней, чымся да надыходзячага зьезду саветаў. Таму, каб хоць бы найбольш важныя галіны народнае гаспадаркі атрымалі аснову для далейшага разьвіцьця, неабходна зараз-жа заняцца складаньнем пляну разьвіцьця гэтых галін гаспадаркі на 2-3-хгадовы перыяд часу. Пяцігадовы плян павінен забясьпечыць, куды больш шпаркі ўзьдым сельскае гаспадаркі ў параўнаньні з сучасным, бо адзінаю пагрозаю для разьвіцьця індустрыі ў сучасны момант зьяўляецца існуючы ўзровень нашае сельскае гаспадаркі. Да ўзьняцьця сельскае гаспадаркі неабходна ісьці шляхам узьняцьця гаспадаркі бядняцкіх і серадняцкіх гушчаў селянства праз кааперацыю, праз сельска-гаспадарчы крэдыт, праз калектывізацыю селянскае гаспадаркі.

Сакольнікаў падкрэсьлівае, што яго пастаноўка пытаньня аб пяцігадовым пляне народнае гаспадаркі каронным чынам разыходзіцца з пастаноўкаю пытаньняў, апазіцыі. Гэтая прычына, а таксама ўнутрыпартыйныя рознагалосьсі прымусілі яго разыйсьціся з апазіцыяй, якую ён падтрымліваў некаторы час назад. Вопыт апошніх 2-х гадоў ад часу 14-га партыйнага зьезду прывёў да таго, што ў т. Сакольнікава няма ніякіх асноўных разыходзін з партыяй.

Далей выступілі **РАБАЎ (Бранская губ.), ЗЯЛЯВА (ЗСФСР) І СОБАЛЕЎ (ЦК УсеКЛСМ)** зазначаўшы, што асноўнаю праблемаю для моладзі зьяўляецца вымушаны беспрацоўя, для чаго патрэбна ісьці па лініі запаўненьня брані, па лініі ўцягваньня моладзі ў саматужніцкую прамысловасьць.

Пасьля прамовы Собалева зьезд пастанавіў спыніць спрэчкі і заслухаць заключнае слова дакладчыкаў.

Заключнае слова т. Кржыжаноўскага.

Тав. Кржыжаноўскі зазначае, што спрэчкі далі вялікі дадатковы матэрыял да дакладаў аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі. Партыя вельмі блізка падышла да ўсіх асноўных разьдзелаў яго, — і гэта зьяўляецца лепшаю гарантыяю таго, што ёй удасца выканаць пастаўленую перад сабою мэту.

Спыняючыся на галоўным напрамку спрэчак, т. Кржыжаноўскі высоўвае два пытаньні: пытаньне аб пляванай і гаспадарчай вялікіце і пытаньне аб капітальнай працы.

Что-ж датычыць вялікіты, — гаворыць таварыш Кржыжаноўскі, — дык тут барацьба павінна весьціся на лініі агульнае ліквідацыі бюракратызму.

Гаспадарчая вялікіта павінна расьці самым рашучым парадкам. Другі недахоп — хістаньне, якое назіраецца ў капітальным будаўніцтве — ёсьць вынік слабо пастаўленае пляванае гаспадаркі. Тав. Кржыжаноўскі лічыць правільнымі заўвагі дэлегатаў зьезду адносна патрэбы эканамічнага райёнаваньня. Асноўны вывад, які належыць зрабіць у гэтым пытаньні такі, што мы павінны ў самы кароткі тэрмін распачаць эканамічнае райёнаваньне краю. Уладзімір Ільліч не адзін раз падкрэсьліваў выключную важнасьць гэтае праблемы. Ён гаварыў, што гэтая справа настолькі вялікая і цяжкая, што яна патрабуе доўгае грамадзкае падрыхтоўкі. Зараз гэтая стадыя мінула. Глеба да райёнаваньня створана. Падрыхтаваны адпаведны партыйны актыў, аб чым сьведчаць спрэчкі і наогул уся праца XV-га партыйнага зьезду.

Далей у сваёй прамове т. Кржыжаноўскі адзначае недахопы статыстыкі. Трэба дамагчыся зьвяшчэньня саматужніцтва ў галіне навуковае статыстыкі; усе сучасныя разрэзьненасьці статыстычных сіл. Ленін яго раз даваў дырэктывы ў гэтым напрамку. Ён гаварыў, што статыстыкі павінны быць вашымі надзейнымі памоцнікамі, а не схаластыкамі.

Адхіляючы некаторыя папрокі, кінутыя украінскімі таварышамі, т. Кржыжаноўскі падкрэсьлівае, што разьвіцьцё транспарту ў належнай меры забясьпечваецца нашаю пяцігодкаю, пры чым палкам забясьпечаны інтарэсы воднага транспарту. У гэткай самай меры няправільна абвінавачаньне ў адсутнасьці ў пляне правільнае ўстаноўкі для электрапрамысловасьці. Электрычнай прамысловасьці пяцігадовы плян дае ўсе неабходныя ўмовы для пасьпяшнага разьвіцьця. Водлуг думкі дакладчыка, боязь, што Днепрастрой ня будзе разьвіваецца водлуг першапачатковых праэктаў, ня мае жаднае падставы. Асноўная мэта электрыфікацыі — зрабіць буйныя электрычныя станцыі цэнтрамі прыцягваньня прамысловасьці, — застаецца ў моцы.

Ленінскі наказ, — гаворыць у сваім заключным слове т. Кржыжаноўскі, — д'ў вялікія вынікі. Тое, што некалькі год назад здавалася немажлівым і фантастычным — зрабілася зараз рэальнаю справаю, якая ўтвараецца нашымі рукамі. Я ўпэўнен, што новыя плыны, якія ставяць перад сабою партыя і рабочая клясa, таксама будуць поўнасьцю выкананы. (Воплескі).

* * *

Пасьля заключнага слова т. Кржыжаноўскага гаворыць заключнае слова т. Рыкаў. Зьезд аднагалосна ўхваліў зацьвердзіць У якасьці асновы тэзісы Цэнтральнага Камітэту па дакладзе аб пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі.

Для выпрацоўкі рэзалюцыі па дакладах т. Рыкава і Кржыжаноўскага зьезд выдзяляе камісію з 43-х чалавек.

Пасьля гэтага зьезд аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю па справаздачы ЦКК. Абвяшчаецца перарыў да 16 сьнежня. Вячэрняга пасяджэньня не было.

Манэўры і мары.

Аб англа-савецкіх дачыненьнях.

Гэтымі днямі ўвесь міжнародны друк піша аб спатканьні тав. Літвінава з Чэмбэрленам у Жэневе. Гэта спатканьне, як ужо вядома нашым чытачом, не дало ніякіх вынікаў. Аднак, самы факт, што Чэмбэрлен заявіў аб жаданьні спаткацца з т. Літвінавым, заслугоўвае ўвагі.

Прайшло ўжо некалькі месяцаў, як у ангельскім урадзе канчаткова перавялі так званыя цьвёрдалобыя, г. зн. самыя крайнія, самыя незамірымыя кансэрватары накшталт Чэрчыля, Хікса і інш.

Якія-ж вынікі іх палітыкі? Самыя недарочныя.

Перш за ўсё палітыка цьвёрдалобых стварыла поўныя няжкасьці ў міжнародным становішчы Англіі. Настойлівыя спробы прымусіць Францыю і Японію трымацца палітыкі Англіі, асабліва ў пытаньні аб дачыненьнях з СССР, — скончыліся блазумоўнай няўдачай. Адначасова з гэтым Англія надзвычайна абвастрыла ўзаемаадносіны з Амэрыкай. Калі яшчэ нядаўна можна было гаварыць аб англа-амэрыканскім **спаборніцтве**, дык зараз прыходзіцца гаварыць аб адкрытай англа-амэрыканскай **варожасьці**.

Палітыка цьвёрдалобых гэткая, што нават такія старыя кансэрватары, як лёрд Сэсыль, зараз ад яе адхрышчваюцца і выходзяць са складу ангельскага ўраду.

Вось некаторыя вынікі ў галіне замежнай палітыкі цьвёрдалобых. Таксама дрэнна стаіць справа ва **ўнутранай палітыцы**.

«Думаць, што ў ангельскай вугольнай прамысловасьці ўсё добра, — гэта значыцца: марыць на-яве». Так прымушан быў заявіць у парляманце ангельскі міністр гандлю. Да гэтага дадамо: не заўважваць сур'ёзных фінансавых цяжкасьцяў Англіі і бязупыннага заняпаду яе замежнага гандлю гэта таксама значыць: марыць на-яве.

Ідучы на разрыў з СССР, цьвёрдалобыя разьлічвалі, што хоць разрыў і дасьць страты ангельскаму гандлю, усё-ж яшчэ хутчэй будзе мець страты СССР ад фінансавай блёкады, якая будзе ўстаноўлена супольнымі патугамі ангельскага ўраду і дзяльцоў з Сіці (гандлёвы і банкірскі квартал у Лёндане).

Аднак, гэтыя надзеі пацярпелі **крушэньне**. Не зважаючы на стараньні Англіі, гаспадарчыя ўзаемаадносіны СССР з замежнымі дзяржавамі ня спыняюць разьвівацца. Адмова ў крэдытах з боку некаторых чужаземных фірм, зробленая пад уплывам Англіі, не змагла значна адбіцца на разьмерах замежнага гандлю СССР. Зварот нашага замежнага гандлю ў кастрычніку дасягнуў 132 млн. руб., і пры гэтым вываз нашых тавараў заграніцу перавышаў закупкі намі чужаземных тавараў амаль на 7 млн. руб.

Між тым замежны гандаль Англіі ня толькі зьмяншаецца, але з кожным месяцам робіцца ўсё больш і больш **пасыўным**, — г. зн. Англіі ўдаецца ўсё менш прадаваць сваіх тавараў за **межамі** і прыходзіцца ўсё больш купляць чужыя тавары, што бясспрэчна адбіваецца на агульным фінансавым становішчы краіны.

Паленьшыць становішча магло-б толькі разьвіцьцё гандлю з СССР. Але яно немагчыма пры адсутнасьці нармальных узаемаадносін паміж абедзьвюма дзяржавамі. Таму нездаволеньне замежнай палітыкай цьвёрдалобых захапляе зараз усё больш шырокія колы Англіі. Паасобныя групы ангельскіх прамыслоўцаў усё больш настойліва патрабуюць адпаўленьня зносін з СССР. Усё часьцей ангельскі ўрад атрымлівае рэзалюцыі ад розных правінцыяльных гандлёва-прамысловых палат, у якіх першае месца займае іменна гэта патрабаваньне.

Усе гэтыя абставіны прымушаюць цьвёрдалобых падумаць аб зьмене палітыкі да СССР. Цьвёрдалобыя прадбачаць, што на надыходзячых у Англіі ўсеагульных перавыбарах, на якіх будзе вырашан лёс сучаснага ўраду, ворагі цьвёрдалобых сваім галоўным выбарчым лёзунгам высунуць адпаўленьне зносін з СССР. І гэты лёзунг можа даць ворагам кансэратараў большасьць галасоў. А таму цьвёрдалобыя і спрабуюць зараз намацаць глебу для магчымага адпаўленьня зносін з СССР, — намацаць на той выпадак, калі ліквідацыя разрыву будзе неабходнай для ратунку кансэрватараў на будучых выбарах.

Вядома, гэта **ня значыць**, што цьвёрдалобыя думаюць адмовіцца ад палітыкі барацьбы з СССР. Наадварот, маюцца ўсе падставы спадзявацца, што гэтая барацьба на справе будзе весьціся ўсё больш настойліва і шырока. Калі цьвёрдалобыя і адважацца на адпаўленьне дачыненьняў з СССР, дык гэта будзе толькі **часовы манэўр** з іх боку.

З другога боку, адпавіць зносіны з СССР, — гэта значыць для цьвёрдалобых **адкрыта расьпісацца ў зробленай імі памылцы, адкрыта прызнацца ў зробленых імі падлогах і ашуканстве**, у той час як яны сьцьвярджалі, што ў савецкіх установах у Лёндане былі знойдзены быццам нейкія «злачынныя» дакументы.

На гэта цьвёрдалобыя не адважацца, — пакуль да ўсеагульных перавыбараў яшчэ досыць далёка, і можна «памаўзіраваць».

Таму Чэмбэрлен у перамовах з т. Літвінавым зноў высунуў недарэчнае патрабаваньне аб спыненьні дзейнасьці Камінтэрну, ведаючы наперад, што гэтае патрабаваньне ня можа быць прынята.

На новыя крокі цьвёрдалобых т. Рыкаў у сваёй нядаўняй прамове ў Харкаве даў зусім ясны і цьвёрды адказ: СССР гатоў аднавіць зносіны з Англіяй на ўмовах узаемнага няўмешваньня ва ўнутраныя справы.

Толькі на падставе **поўнай роўнасьці бакоў** савецкі ўрад можа згадзіцца весьці перамовы з Англіяй. Разьлічваць, што савецкі ўрад пойдзе, каб дагадзіць цьвёрдалобым, на адпаўленьне ад асноў сваёй палітыкі дзяржавы працоўных, — гэта значыць, як гаварыў ангельскі міністр, марыць на-яве.

Ц—і.

КРЫВАВЫ БАЛЬ ПАЎДНЕВА-КІТАЙСКАЕ БУРЖУАЗЕІ.

ТЫСЯЧЫ РАССТРЭЛЕНЫХ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.—КАНТОНСКАЕ КОНСУЛЬСТВА СССР АПЯЧАТАНА.---АРЫШТЫ НЯ СПЫНЯЮЦЦА.

ШАНХАЙ, 15-XII. У зьвязку з прыдушэньнем кантонскае рэвалюцыі, у Ганконзе ўважліва правяраюць паперы ўсіх, хто прыяжджае з Кантону, і абшукваюць іх. Водлуг вестак друку, такім парадкам арыштавана ўжо блізка 200 кітайскіх камуністаў.

Як паведамляе агенцтва Тохо, **Кантонская войсковая рада ўхваліла апячатаць савецкае консульства ў Кантоне.** Тэлеграма Рэйтэра з Кантону завярае, што там **арыштавана 13 расейцаў, адказных за нядаўнія падзеі, прычым трое з іх ужо расстрэлены, а рэшту перад пакараньнем смерцю водзяць па вуліцах гораду. Растрэльваюць усіх замешаных у руху, усіх, хто мае чырвоную зорку на грудзёх. Расстраляна 40 камуністак, якія спрабавалі прабрацца на той бок рэчкі.**

Вобыскі ня спыняюцца па ўсім горадзе і ва ўсіх прафсаюзах. Западозраных у камунізьме расстрэльваюць, забіваюць і душаць на месцы. У рабочым шпіталі расстраляна 70 чалавек. Друкары і наборшчыкі, якія ў часе нераваароту актыўна падтрымлівалі камуністаў, у большасьці ўцяклі з Кантону. Лічацца з магчымасьцю, што газэты ў хуткім часе спыняцца выходзіць.

* * *

ШАНХАЙ, 15-XII. Кітайскія газэты ў Ханькоу паведамляюць, што горад Хуан-Ань (у паўночнай частцы правінцыі Хубэй), які ў працягу тыдню знаходзіўся ў руках селян і камуністаў, захоплен урадавым войскам. Забіта 1500 камуністаў і сялян.

Адначасна паведамляецца, што рэгулярнае войска прыдушыла сялянскія паўстаньні ў Хайлуфуні і заняло горад.

Як паведамляе ханькоўская прэса, ва Ўхане выкрыта хубэйская арганізацыя кампартыі, у зьвязку з чым учынена шмат арыштаў.

У кітайскай частцы Шанхаю адбываюцца нясупынныя вобыскі з мэтаю злавіць камуністаў.

У абарону кітайскае рэвалюцыі.

Мітынгі і маніфэстацыі ў Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 14-XII. «Уоркерс Партыі» (камуністычная) арганізавала масавыя мітынгі і маніфэстацыі пад лёзунгам абароны кітайскае рэвалюцыі ад наскоку імпэрыялістаў.

Лёс захопленага параходу „Сімфэропаль".

ПЕКІН. Шадуньская вайсковая ўлада разгружае і абшуквае захоплены ў Цындао савецкі параход „Сімфэропаль" і заяўляе што шукае зброі. Вобыск на адначасна захопленым кітайскім параходзе, зафрактаваным савецкем гандлёвым флётам пя даў ніякіх выпікаў.

Міністр замежных спраў і ўлада патрабуе выплаціць ім за разгрузку параходаў 1500 даляраў.

ПЕРАД ВЫБАРАМІ У ПОЛЬШЧЫ.

КАМУНІСТЫ І ВЫБАРЫ Ў СОЙМ.

Польская кампартыя, як паведамляе „Роботнік", пастанавіла выставіць уласны сьпісак на выбарах у сойм па ўсіх выбарчых акругах.

Блён буржуазных меншасьцяў трашчыць.

Клясава несьвядомыя элементы нацыянальных меншатьцяў Польшчы, якія зблёкаваліся дзеля выбараў у сойм, ня зусім чуюць сябе поўнымі і магчымы, што яшчэ дойдзе да адрыву некаторых груп ад блёку. З усіх украінскіх партый да блёку ўступіла толькі «УНДО», а з боку беларусаў вельмі слабая фактычна група Эрэміча і Рагулі.

Пяст і хадэкі.

Перамовы між партыяй «Пяст» і хрысьціянскімі дэмакратамі спыніліся ў сувязі з акцыяй арганізацыі новага блёку ўсіх каталіцкіх партый правага кірунку.

Генэральны камісар.

Генэральным камісарам на выбарах у сойм назначан прыхільнік Пілсудзкага, тав. міністра справядлівасьці п. Цар.

Санацыя і фальваркі.

Урадавая санацыя вьярнула ў апошнія часы сваю асаблівую ўвагу на беспартыйных і «лаяльных» абшарнікаў, якія трымаюцца так званага «дзяржаўнага» палітычнага кірунку.

Сэнсацыйны разбой.

13 сьнежня заўважана, што ў сойміным памяшканьні эндэцкай партыі зроблен узлом. Разьбіты 2 шафы і 3 шафкі старшыні клюбу Гламбінскага і пасла Заморскага і шафкі генэральнага сэкратарыяту эндэцкага клюбу.

Пасьля раптоўнай прапажы ген. Загурскага гэта новая авантура моцна ўзбудзіла польскую чорную сотню.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ПОЛЬШЧЫ.

Становішча беспрацоўя ўзрастае. З сьнежня зарэгістравана беспрацоўных 178.681 Беспрацоўе павялічылася на 26.074 асобы.

Пабудова трамваяў.

Віленская рада пастанавіла распачаць пабудову трамвайнай лініі летам наступнага году. Прадугледжваецца пабудова 20 клм. Пабудова будзе трываць 2 гады.

ПАСЬЛЯ ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКАГА „ЗАМІРЭНЬНЯ".

Ацэнка жэнеўскае пастановы прэсаю Літвы.

КОЎНЯ, 15-XII. Літоўскі афіцыёз «Летува» зьмяшчае перадавіцу аб рэзалюцыі рады Лігі Нацый наконт польска-літоўскага канфлікту.

Газэта лічыць ухваленую ў Жэневе пастанову «сталоўчым зьявішчам у літоўскай замежнай пасітыцы» і адзначае, што перамовы аб адпаўленьні польска-літоўскіх узаемаадносін «таксама павінны расцэньвацца станоўча, бо дадуць Літве магчымасьць яшчэ раз заявіць аб сваіх правох на Вільню».

«Нармальныя ўзаемаадносіны з Польшчаю — піша газэта, — немагчымы без выпраўленьня парушанага Польшчаю Сувальскага ўгавору і без зваароту Вільні Літве. Апрача таго, пачатак чыгуначных зносін патрабуе папярэдняга ўрэгуляваньня пытаньня аб граніцах- Літва ня прызнала і ня можа прызнаць граніцаю сучасную дэмаркацыйную лінію з Польшчаю».

Орган народнікаў — сялян «Летувос-Жынёс» піша: «Адзіны пункт у карысьць Літвы ў пастанове рады Лігі Нацый, датычыцца дазволу высланым літоўцам вярнуцца ў Вільню. Урэшце піша газэта — акт 10-га сьнежня, нібы ўхвалены па ініцыятыве Літвы, абгрунтаваны на варожых Літве інтарэсах, хоць і прыкрыты прыгожымі мірнымі лёзунгамі".

„Пераможца" Пілсудзкі

Пасьля свайго пабыту ў Жэневе, дзе Польшча не атрымала мандату на захват Літвы, марш. Пілсудзкі вярнуўся ў Варшаву, дзе яму яго прыхільнікі наладзілі ўрачыстае спатканьне, як «пераможцы».

Ушанаваньне Вальдэмараса.

Сталіца Літвы-Коўна гатуе Вальдэмарасу ўрачыстае спатканьне, якое знаходзіцца ў сувязі з „перамогай" яго на Жэнеўскай канфэрэнцыі.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

РАСКОЛЬНІЦКАЯ ЧЫННАСЬЦЬ АПАЗІЦЫІ У ЛЕНІНГРАДЗЕ.

Антыўныя фракцыянэры выключаны з партыі.

ЛЕНІНГРАД. Ленінградзкая абласная кантрольная камісія паведамляе, што пасьля дакладнага расьсьледаваньня КК выявіла, што 3 і 4 сьнежня група апазіцыянэраў наладзівала нелегальныя сходы, прычым выяўлена, што на сходзе 4 сьнежня прысутнічала 25 чалавек, у тым ліку некалькі выключаных з партыі. Асноўнымі кіраўнікамі гэтых сходаў былі Сафараў, Якавін, Гесэн і Аляксандраў. Выяўлена, што практычнаю мэтаю гэтых сходаў была не ліквідацыя фракцыі, а выпрацоўка новае проціпартыйнае тактыкі. Выступаўшы на сходзе дакладчыкам Сафараў гаварыў аб пададзенай апазіцыяй заяве зьезду, прычым адзначыў, што заява гэтая — толькі топкі манэўр апазіцыі, які дасьць вынікі пры 2—3 месяцы. Ленін не парываць сувязі з партыяй для таго, каб унутры яе весьці працу, развальваючую большасьць і перацягваць серадняка на бок апазіцыі. Сход скончыўся ўхвалаю рэзалюцыі і пасылкаю дэлегата ў Маскву ў цэнтр трацкісткае апазіцыі.

Бяручы пад увагу гэтыя абставіны, КК пастанавіла выключыць Сафарава, Гесэна, Якавіна і Аляксандрава з шэрагаў УсеКП(б) і пастанову гэтую накіраваць на зацьверджаньне камісіі партыйнага зьезду па разглядзе матэрыялаў аб дзейнасьці апазіцыі.

ВЫКЛЮЧЭНЬНЕ ФРАКЦЫЯНЭРАЎ З ПАРТЫІ.

ТЫФЛІС, 16-12. Прэзыдыум ЦКК кампартыі Грузіі выключыў з партыі за фракцыйную працу 18 чалавек.

* * *

БАКУ, 15-12. ЦКК Азэрбайджанскае кампартыі выключыла з партыі **АГАНЕЗАВА**, які спэцыяльна прыехаў у Баку для фракцыйнае працы, і **ХАНБУДАГАВА**, былушага левага эс-эра, які праводзіў падпольную фракцыйную працу, але ня выказваў сваіх поглядзяў і адкрыта выступаў за напрамак партыі.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 15-12. Прэзыдыум акруговае КК выключыў з партыі за актыўную фракцыйную дзейнасьць 7 чалавек, якія арганізоўвалі фракцыйныя сходы і прапагандавалі ідэі трацкізму сярод камсамольцаў і беспартыйных.

РАСПАД ГРУЗІНСКАЕ АПАЗІЦЫІ.

ТЫФЛІС У ЦК кампартыі Грузіі зьвярнуліся з заявай аб адыходзе ад апазіцыі ранейшыя апазіцыянэры Лашхі-Шарыя, Джаварашвілі, Кутатэлідзе і Балашвілі.

МІРНЫЯ ЗАВАЁВЫ БЕЛАРУСІ ЗА МЕЖАМІ.

(Ад уласнага бэрлінскага карэспандэнта).

На гэту тэму мы ўжо пісалі па старонках «Савецкай Беларусі». Яшчэ больш падрабязна і поўна гаворыць аб тым-жа ў сваіх нарысах «Па чатырох краінах» З. Жылуновіч. Таму, у гэтым артыкуле мы зробім агляд толькі тых фактараў, якія мелися ў апошнія месяцы. Гэта будзе тым больш да-рэчы, што канчаецца год. А напярэдадні новага году не падсумоўвае толькі той, каму пагражае банкрутства. Нам жа банкрутства баяцца ня прыходзіцца. Наадварот, усё навокал гаворыць, што „акцыі" Савецкай Беларусі на міжнародным рынку павышаюцца. Удзельная вага рабочых і сялян БССР, як будаўнікоў новага жыцьця, мацнее. Зараз ужо ня знойдзецца ў Эўропе такога чалавека, які-б лічыў беларусоў проста «русамі», а СССР—Расеяй. Праўда, для кароткасьці, прастаты і практычнай выгоды ў Эўропе ўсё яшчэ вымаўляецца «Расея», але—з кожным днём гэта назва раскладаецца ўсё больш і больш на народныя множнікі СССР, сярод якіх Беларуская ССР займае адно з першых месц.

Стварылася ўсё гэта не адразу. Лёд замежнага неразуменьня расейскай сапраўднасьці быў вельмі таўсты. Прызвычаіўшыся бачыць Расею афіцыйную, замежамі ўпарта не хацелі заўважваць Расеі народнай. На старой памяці чужаземец лічыў рэвалюцыйную Расею, а потым СССР проста нязручным суседам з усходу, якога трэба баяцца. Ніхто не хацеў пазнаёміцца з гэтым „вязручным суседам" бліжэй. Зношаны арганізм старой Эўропы ўмеў толькі гледзячы на ўсход, калаціцца. Аб тымжа, што на Савецкім Усходзе будуецца садружаства вольных народаў, новае мірнае жыцьцё, ніхто не хацеў ведаць. Народам новага Савецкага Саюзу прыходзілася пачынаць свой культурны паход заграніцу з азбукі.

Мірнай заваёве Беларусьсю заграніцы вельмі спрыяў апошні прыезд у канцы лета г. г. беларускіх пісьменьнікаў: Цішкі Гартнага, Міхася Чарота і Міхася Зарэцкага. Даведаньне імі культурных цэнтраў замежамі стварае цэтую эру. Спыняцца, аднак, на гэтым мы ня будзем, бо аб гэтым чытач можа падрабязна даведацца з нарысаў З. Жылуновіча ў «Савецкай Беларусі» «На чатырох краінах».

Наш агляд апошніх посьпехаў пачнём з газэты «Ды Вэльт ам Абэнд». Аб гэтым органе на старонках «Савецкай Беларусі» ўжо спаміналася. Гэта газэта незалежнай думкі левага ўхілу. Выходзіць яна ў Бэрліне і выдаецца ў колькасьці 200 тысяч экзэмпляраў. Іншымі словамі, зьяўляецца найбольш распаўсюджанай вячэрняй газэтай Нямеччыны. У гэтай газэце 22 жніўня быў зьмешчан артыкул аб уваскрашэньні Беларусі, яе геаграфічным стане, культурным становішчы, гаспадарчым жыцьці і інш. У артыкуле зьмешчаны статыстычныя даныя. А прымаючы пад увагу, што немец чалавек дасьціпны, любіць толькі лічбы, дык гэты артыкул у яго галаве ня мог не пакінуць аб Беларусі ўражаньня цэльнага і закончанага.

На другі дзень у гэтай самай газэце была зьмешчана фатаграфія Менску з зазначэньнем, што гэта «сталіца Беларусі». У штодзённай прэсе Нямеччыны наталкі аб Беларусі пападаліся і раней, але ня ў гэткім поўным і ўсебаковым выглядзе. Справа ў тым, што немцы—публіка надзвычайна практычная. Яны на ўсякую справу глядзяць з камэрцыйнага пункту гледжаньня. З гэтай прычыны нават Саюзу Савецкіх Рэспублік у цэлым нямецкія газэты падаюць мала бесстароннянай увагі. Таму бесстароннянь артыкул у сталічнай нямецкай газэце па якому небудзь пытаньню прыходзіцца адносьці на кошт бязумоўнай вартасьці гэтага пытаньня.

Наступная ўвага Беларускай ССР пададзена бэрлінскім часопісам «А-І-Ц». У нумары 45 зьмешчана фатаграфія вышэйпамянёных беларускіх пісьменьнікаў: Цішкі Гартнага, Міхася Чарота і Міхася Зарэцкага. Зьмяшчэньне іх фатаграфій прыстасавана да іх прыезду ў Нямеччыну, дзе яны мелі спатканьне з выдатнымі прадстаўнікамі нямецкіх пралетарскіх пісьменьнікаў і нямецкай пралетарскай культуры. Аўтар гэтага артыкулу меў прыемны гонар аказаць тэхнічную паслугу ў справе спатканьня прадстаўнікоў двух пралетарскіх культур: беларускай і нямецкай.

У часе дзесяцігодзьдзя Кастрычніка нямецкія левыя выданьні адвялі Савецкай Беларусі таксама ня мала месца. Але найбольш поўна яна была выяўлена ў спэцыяльным артыкуле ранейшага беларускага гандлёвага прадстаўніка ў Бэрліне І. Лубужа ў штомесячніку «Дас Нэйе Руслянд». Артыкул Лубужа дае кароткі абгляд узьнікненьня культурнага і гаспадарчага разьвіцьця Беларускай ССР ад пачатку яе існаваньня і да нашых дзён. Заканчваецца артыкул рапэйшага беларускага гандлёвага прадстаўніка наступнымі словамі:

— Да дню дзесяцігадовага юбілею Беларуская Савецкая Рэспубліка з гордасьцю аглядаецца на свае дасягненьні і мае толькі адно жаданьне: каб яе суседзі не парушалі яе волі, каб яна магла далкам заняцца мірнай працай на пабудове сацыялізму.

Наступным момантам, прычым момантам найбольш важным і яскравым у справе мірных заваёў Беларусі трэба лічыць ліст рэдактара штомесячніка «Бюхэрэй фюр Але» да аўтара гэтых радкоў, у якіх ён паведамляе, што ў бліжэйшым нумары часопісі будзе надрукавана аповесьць Чарота «Галя». Аповесьць ужо ў наборы.

На нямецкай мове маюцца пераклады з Янкі Купалы і Якуба Коласа. Іх можа пабачыць кожны, хто пажадае прачытаць вышаўзную гэтымі днямі ў Вене «Анталёгію Сусьветнае Літаратуры XX-га века». Але там Беларусь прадстаўлена ніби як дадатак да сусьветнай літаратурнай скарбніцы.

У часопісу «Бюхэрэй фюр Але» Беларусь выступае як прадстаўніца цэлага самастойнага жыцьця і культуры.

На гэтым мы і скончым наш агляд. Рух незалежнай Беларусі наперад ужо не зьяўляецца праблемай; гэта ўжо ня туманны ідэал, ня здань. Гэта факт, якога самы злы наш вораг ня здолее выкрэсьліць.

Янка Б.

12 XII—27 г. Бэрлін.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

Нота нанкінскага ўраду ураду СССР,

ШАНХАЙ, 15-XII. Сёньня а 17 гадзіне ўнаўнаважаны па чужаземных справах у Шанхаі ўручыў консулу СССР ноту:

„Ужо на працягу некаторага часу. — гав рыцца ў ноце, — нацыянальны ўрад атрымліваў розныя паведамленьні аб тым, што савецкія консульствы і савецкія дзяржаўныя камэрцыйныя агентуры на тэрыторыі, якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй нацыянальнага ўраду, выкарыстоўваліся ў якасьці цэнтраў чырвонай прапаганды і ў якасьці прытулкаў для камуністаў. 11-га сьнежня ў Кантоне адбылося паўстаньне, якое скончылася гвалтоўны і занацьцем гораду камуністамі. Існуюць апаскі, што здарэньні аналёгічнага характару могуць мець месца і ў іншых мясцох

Бяручы пад увагу вышэйшае, гэтым устанаўляецца, што нададзенае консулам СССР, якія знаходзяцца ў розных правінцыях, прызнаньне будзе аануліравана, што савецкія дзяржаўныя камэрцыйныя агэнтуры ў розных правінцыях павінны будуць спыніць сваю чыннасьць з тым, каб можна было зьнішчыць дашчэнту дурны ўплыў і зрабіць пільнае расьсьледаваньне".

Як паведамляюць, аналёгічныя ноты заўтра будуць уручаны савецкім консулам у Кантоне і Ханькоу.

Адказная нота савецкага ўраду.

16 сьнежня генэральнаму консулу СССР у Шанхаі паслана па тэлеграфу дзеля найхутчэйшага ўручэньня камісару па чужаземных справах у Шанхаі ніжэйшая нота савецкага ўраду:

«У адказ на вашу ноту ад 15 сьнежня маю гонар заявіць ад імя савецкага ўраду ніжэйшае:

1) Савецкі ўрад ніколі не прызнаваў так званага нацыянальнага ўраду ў Нанкіне, ад імя якога савецкаму консульству ў Шанхаі ўручана нота ад 15 сьнежня. „Нацыянальны ўрад" у Нанкіне ня можа ня ведаць, што ўсе консульствы СССР існуюць на тэрыторыі Кітая на аснове ўгавору між Кітаем і Савецкім Саюзам, падпісаным у Пекіне ў 1924 г., і кожнае назначэньне консулаў у Шанхай, таксама як у любы іншы пункт Кітая, адбывалася з ведама і згоды пекінскага ўраду. Шанхайскія ўлады, таксама як і ўсякія іншыя мясцовыя кітайскія ўлады, прымалі толькі да ведама гэтыя назначэньні. З гэтаю прычыны ў ноце «нацыянальнага ўраду» у Нанкіне аб аануліраваньні прызнаньня консулаў у розных правінцыях можа азначаць толькі тое, што захаліўшыя ўладу генэралы ў Нанкіне пад нажымам імпэрыялістаў прызналі зручным мець у райёне свайго панаваньня галоўным чынам консулаў тых краін, якія захавалі з кітайцамі „няроўныя ўгаворы".

2) Савецкі ўрад павінен самым рашучым чынам адхіліць галаслоўныя заявы ноты ад 16 сьнежня аб тым, што савецкія консульствы і дзяржаўныя камэрцыйныя агентуры выкарыстоўваюцца „для чырвонай прапаганды і як прытулак для камуністаў". Між іншым, мы павінны самым рашучым чынам адхіліць абвінавачаньне па адрасу нашага консульства ў Кантоне, якое, як быццам, служыла базай для кіраўніцтва рэвалюцыйным рухам рабочых і сялян у Гуандуні. Няма нічога новага ў тым, што рэвалюцыйны рух рабочых і сялян у Кітаі разглядаюць, як вынік чынасьці савецкіх афіцыйных установаў. Вось ужо некальні год, як ворагі кітайскага народу, імпэрыялісты ўсіх краін, разглядаюць валікі рэвалюцыйны рух кітайскага народу, як вынік інтрыг „знадворных сіл". Той факт, што „нацыянальны ўрад" у Нанкіне паўтарае цяпер контр-рэвалюцыйныя легенды прыгнятаецляў кітайскага народу, гэты факт як ня трэба лепш сьведчыць аб тым, чыю волю выконвае ён цяпер.

Савецкі ўрад упэўнен, што пазіцыя, занятая кітайскімі ўладамі ў Шанхаі, перш за ўсё прыносіць шкоду кітайскаму народу і нацыянальным інтарэсам Кітая, што тыя, хто з такой лёгкасьцю пачынаюць праводзіць варожую палітыку супроць СССР, будуць першымі, што адчуе яе адмоўныя вынікі.

Народны Камісар па Чужаземных Справах ЧЫЧЭРЫН.

16-га сьнежня 1927 г.

Загад аб зачыненьні савецкіх установаў.

ШАНХАЙ, 16-XII. Кітайскія газэты Шанхая публікуюць тэлеграфны загад нанкінскага міністра па чужаземных справах У-Чжао-Чу аб тым, што ўсе савецкія камэрцыйныя арганізацыі, банкі, магазыны і пароходныя таварыствы павінны спыніць працу.

Адначасна У-Чжао-Чу прасіў міністэрства фінансаў камандыраваць чыноўнікаў дзеля кіраваньня савецкімі арганізацыямі.

* * *

ШАНХАЙ, 16-XII. Сёньня з раніцы генэральнае консульства СССР абкружана моцным атрадам муніцыпальнае паліцыі, якая абшуквае ўсіх выходзячых і ўваходзячых. Выяжджаўшыя на аўтамабілях супрацоўнікі консульства і аддзяленьня ТАСС здаганяліся паліцэйскімі матацыклеткамі, спыняліся здалёк ад консульства і абшукваліся.

Консульству дадзен 7-мідзённы тэрмін для выезду. У адносінах к гаспадарчым арган

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

[illegible]АСЬЛЕДАВАНЬНЕ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

[illegible]іцебск, 16-XII. Акрстатбюро распа[illegible] выбарачнае абсьледаваньне ся[illegible]кіх гаспадарак на акрузе.

[illegible]трыманыя матар'ялы дадуць маг[illegible]часьць выявіць пляц жытняй вы[illegible] і пакажуць поўны малюнак ура[illegible]ю сёлетняга году.

ВУЧОТ ПАРАБКОЎ.

[illegible]іцебск, 16-XII. Акрстатбюро за[illegible]чыла распрацоўку матар'ялаў аб вы[illegible] с-г. рабочых.

[illegible]аводле даных гэтага вучоту, у [illegible]узе налічваюцца: 3413 парабкоў, [illegible]9 пастухоў, 1315 часовых і сезон[illegible] с-г. рабочых.

СТАН БЕСПРАЦОЎЯ.

[illegible]іцебск, 16-XII. На 1 сьнежня на [illegible]ебскай біржы працы знаходзілася [illegible]0 беспрацоўных; з іх: мужчын—[illegible]9, жанчын—3201, у гэтым ліку [illegible]росткаў—778.

ФІНАНСАВАНЬНЕ ПЧАЛАВОДСТВА.

[illegible]змель, 16-XII. Акруговае таварыства [illegible]ска-гаспадарчага крэдыту атры[illegible] з Белсельбанку 7000 руб. доўга[illegible]міновага крэдыту ў рахунак пляну [illegible] другі квартал па фінансаваньне [illegible]лаводнай справы ў акрузе.

ДА ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Бабруйск, 16-XII. На апошнім па[illegible]жэньні прэзыдыум АВК быў зацьвер[illegible]ін плян перавыбараў саветаў акру[illegible] і райённых зьездаў саветаў. Райён[illegible] зьезды саветаў будуць праводзіц[illegible] ў другой палове сакавіка.

[illegible]кругові зьезд саветаў адбудзецца ў [illegible]савіку.

ПЕРААПРАЦОЎКА МАЛАКА.

Бабруйск, 16-XII. У межах акругі [illegible] савецкіх гаспадарках працуюць [illegible] машын па пераапрацоўцы малака [illegible] масла і сыр.

[illegible]а апошні год выпрацавана 4200 п. [illegible]ру і 800 п. сьметанковага масла.

АЎТОБУСЫ Ў ВЁСЦЫ.

[illegible]етка, 13-XII. Аўтатранспарт на[illegible]іў аўтобусны рух між Гомелем і [illegible]Веткай. Першы аўтобус ужо пры[illegible]ў з Гомеля ў Ветку.

АДНАЎЛЕНЬНЕ СМАЛЯРНЯЎ.

Бабруйск, 16-XII. Зараз у акрузе працуе 49 смалярняў. За мінулы год смалярні пераапрацавалі: 26607 куб. мэтр. карчоў, 1862 куб. мэтр. дроў. Атрымана: 39910 пуд. шыгіпару, 76603 пуды смалы і 146338 пуд. вугалю.

15.000 РУБ. НА АБСТАЛЯВАНЬНЕ МЛЫНОЎ.

Бабруйск, 16-XII. Прэзыдыум акруговага выканаўчага камітэту ў свой час зьвярнуўся з хадайніцтвам у Менск аб воднуску сродкаў на абсталяваньне млыноў камунтрасту. Гэтымі днямі Белсельбанк перавёў на гэтую мэту 15.000 р. доўгатэрміновага крэдыту.

ПАЧАЎСЯ ШКОЛЬНЫ ПЕРАПІС.

Барысаў, 15-XII. Усе падрыхтоўчая праца для правядзеньня школьнага перапісу скончана сваячасова. Сёньня начаўся перапіс, які праводзіцца мясцовымі настаўнікамі і студэнтамі Барысаўскага пэдагагічнага тэхнікуму.

ЗЯМЕЛЬНЫ СУД У ВЁСКУ.

Ворша, 16-XII. Дзеля набліжэньня зямельнага суда да сялянства вылучана 2-ая выязная акруговая зямельная камісія, якая з 17 сьнежня распачынае разглядаць судова-зямельныя справы ў м. Чарэі, а потым у м. Крупкі.

АДНАВІЛІ ФАБРЫКУ.

Ворша, 16-XII. На пераабсталяваньне Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі камунальны трэст патраціў 60 тысяч руб.

Устаноўлен новы рухавік у 100 конскіх сіл, набыта некалькі новых варштатаў. Дзякуючы новаму абсталяваньню павялічыцца прадукцыйнасьць працы на 80 проц.

АДДЗЯЛЕНЬНЕ «АЎТАДОРУ».

Ворша, 16-XII. У Воршы арганізавалася акруговае аддзяленьне таварыства садзейнічаньня разьвіцьцю аўтамабілізму і палепшаньню шляхоў у БССР.

Т-ва ставіць сваёй задачай садзейнічаць шпаркаму пашырэньню ў мясцовым транспарце аўтамабіля і інш. відаў механічных сродкаў зносін, а таксама грамадзкага садзейнічаньня пабудовы і паляпшаньня шляхоў.

Да перавыбараў саветаў.

УДЗЕЛ БЕДНАТЫ І ЖАНЧЫН У ПЕРАВЫБАРАХ.

[illegible]інулыя перавыбары саветаў выя[illegible] вялікую палітычную актыўнасьць [illegible]х слаёў працоўных як у сэнсе ўзмо[illegible]ньня саюзу беднаты з серадня[illegible], так і ўзмацненьня кіруючай ролі [illegible]ючае клясы.

Але побач з дасягненьнямі, меліся і [illegible]хваты: недастатачны ўдзел у пера[illegible]барах беднаты і жанчын.

Перавыбары мінулага году паказалі, [illegible] ў некаторых сельскіх мясцовасьц[illegible] слаба была праведзена падрыхтоў[illegible] праца сярод беднаты і жанчын. Сярод беднаты і жанчын не право[illegible]лася сталай і плянавай падрыхтоў[illegible] к таму-ж сама падрыхтоўка пачы[illegible]лася за некалькі дзён да перавы[illegible]раў.

Каб ня быць галаслоўным у гэтым [illegible]таньні, лічу неабходным прывесьці [illegible]ыклад: в. Кузьмінічы, Чавускага р., [illegible]нічае больш ста двароў пераважна [illegible]цняцкіх, а калі прышлося сельсаве[illegible] рабіць там справаздачу, то на сход [illegible]наты зьявілася некалькі чалавек. [illegible]ам і думаем: ці адкласьці справаз[illegible]ту на другі дзень, ці зараз паслаць [illegible]завека, каб ён сходзіў у кожную [illegible]ту і пазваў на сход.

Нічога ня вышла, зусім мала прыш[illegible] беднаты, пры чым заможныя сяля[illegible] і гарлапаны—кулакі амаль усе [illegible]явіліся, калі, надварот, бедната па[illegible]на была заняць першае месца на [illegible]одзе. На сходзе ўвесь час крычалі з усякага толку і працу сельсавета [illegible]ызналі кепскай.

Чаму так здарылася? А таму, што ў вёсцы Кузьмінічах была праведзена зусім малая праца сярод беднаты, якой ня было добра растлумачана значэньне саміх перавыбараў і ролі ў іх беднаты.

Бязмоўна, гэткіх выпадкаў ёсьць многа і іх трэба ў гэтым годзе сваячасова прыняць пад увагу і выпраміць. Падрыхтоўчая праца да перавыбараў пачалася з 1-га сьнежня; зараз-жа неабходна прыступіць і да падрыхтоўкі беднаты ва ўсіх вёсках, памятаючы тое, чаго пры сталай і плянавай падрыхтоўцы магчыма, дабіцца добрых вынікаў. Напр., у тымжа Чавускім райёне, ў в. Ужар, якая мяжуецца з Кузьмінічамі—была праведзена добрая падрыхтоўка сярод беднаты, так і справаздачная і перавыбарная кампаніі прайшлі добра пры шырокім удзеле беднаты.

Што датычыцца жанчын, то яны зусім нязначны ўдзел прымалі ў перавыбарах саветаў. У некаторых сельсаветах сяляне ня зусім добра адносіліся да жанчын, лічачы, што жанчыне няма справы да перавыбараў і калі выстаўлялі іх кандыдатуры, то за іх не галасавалі.

У гэтым годзе неабходна шырэй растлумачыць значэньне жанчын у перавыбарах саветаў шляхам правядзеньня жаночых сходаў да правядзеньня справаздачнасьці і перавыбараў, што дасьць магчымасьць большаму ўцягненьню сялянак у савецкае будаўніцтва праз удзел у саветах.

Я. Зб.

Рабочае жыцьцё.

Перазаключэньне калдагавораў.

Кампанія перазаключэньня калектыўных дагавораў павінна быць закончана да 1 студзеня.

Дзеля таго, каб пазбавіцца ў новых калдагаворах розных недахватаў, прэзыдыум ЦСПСБ даў загад усім саюзам праверыць, як выконваліся старыя дагаворы. Адным з такіх недахватаў зьяўляюцца ў некаторых прадпрыёмствах спазьненьне з выдачай пэнсіі і затрымкі з выдачай спэцадзеньня.

У многіх саюзах ужо шырока абмяркоўваюцца новыя калектыўныя дагаворы, але ёсьць яшчэ і такія саюзы, якія не абмяркоўваюць гэта пытаньне пры ўдзеле шырокіх мас.

Перад заключэньнем новых калектыўных дагавораў стаяць 3 пытаньні: павышэньне фонду зарплаты, правядзеньне тарыфнай рэформы і часовай працы.

Увогуле фонд зарплаты павышаецца на 1,5 проц., што дае 274 тыс. руб. павышэньня ў параўнаньні з мінулым годам. Павышэньне зарплаты датычаецца толькі асноўных відаў прамысловасьці. Ураўнены стаўкі рабочых у прадпрыёмствах аднароднай прамысловасьці. Павялічэньне фонду зарплаты датычаецца наступных відаў прамысловасьці: шкляной—на 25 тыс. руб., сярніковай—80 тыс. руб., дрэваапрацоўчай—30 тыс. руб., папяровай—25 тыс. руб., харчовай—30 тыс. руб., лёна-апрацоўчай—34 тыс. руб., металёвай—9 тысяч руб. і інш.

Што-ж датычыцца тарыфнай рэформы, то ў БССР яна ўводзіцца ў саюзах: хімікаў, краўцоў, папяровай і скураной прамысловасьці. Тарыфная рэформа зьмяншае разьбежку паміж асноўнай стаўкай і зьдзельшчынай, павялічваючы значна асноўную стаўку. Апроч таго, павышана зарплата найбольш адсталых груп рабочых. Калі раней суадносіны паміж 1-ым і 10-м разрядам складалі 1:4,2, то зараз засталося толькі 8 разрадаў і суадносіны іх складаюць, як 1:2,8. Напрыклад, токар па мэталю раней атрымліваў у дзень 3 руб. 45 к. і выпрацоўваў яшчэ 118 проц., усяго 7 руб. у дзень, то па новаму тарыфу асноўная стаўка яго складае 5 руб. 60 к., а зьдзельная выпрацоўка складае толькі 62 пр. Ад павышэньня ўдзельнай вагі тарыфнай стаўкі выгрываюць часовыя рабочыя, а зьдзельшчыкі нічога ня губляюць. Напрыклад, фурман (часовы рабочы) у папяровай прамысловасьці ўперад атрымліваў 2 р. 01 к., па новаму тарыфу 2 р. 25 к. у дзень.

Па новаму тарыфу будзе пазначнае памяншэньне прыпрацоўкі, але гэта датычыцца толькі невялікай групы рабочых.

Пры заключэньні калектыўных дагавораў трэба сёлета пераглядзець норны выпрацоўкі. Старыя нормы ўстарэлі, асабліва ў тых прадпрыёмствах, дзе праведзена новае абсталяваньне.

Кампанія калектыўных дагавораў пачалася вельмі позна. Гэту кампанію трэба было распачаць у лістападу, перад складаньнем каштарысу, а то зараз некаторыя прадпрыёмствы могуць адмовіцца ад некаторых выдаткаў, якія ня былі прадугледжаны пры складаньні каштарысаў.

Новая музыка асьветы рабочых.

(Віцебск).

11 сьнежня ў памяшканьні Беларускага Вэтэрынарнага Інстытуту адбылося адчыненьне Нядзельнага Рабочага Унівэрсытэту.

Ужо з 10 гадзіны раніцы запоўнены калідоры рабочай моладзьдзю. Вялікая заля пераапоўнена, і адміністрацыя змушана зьвярнуцца да студэнтаў Вэтэрынарнага Інстытуту і рабфаку з просьбай асвабадзіць месца для студэнтаў Нядзельнага Рабочага Унівэрсытэту і гасьцей, сярод якіх прадстаўнікі ўсіх партыйных, савецкіх, прафесыянальных і грамадзкіх арганізацый. Няма ўрачыстых аркестраў, а проста ў парадку будённай працы навуковы працаўнік Вэт. Інстытуту Бжозэ абвяшчае НРУ адчыненым.

Падкрэсьліўшы значэньне асьветы для пралетарыяту, калі яму прыходзіцца арганізоўваць вытворчасьць у сацыялістычным будаўніцтве і кіраваць пралетарскай дзяржавай, Бжозэ адзначае вялікае значэньне факту зблiжэньня навуковых працаўнікоў з працаўнікамі вытворчасьці і жаданьне іх прыйсьці на дапамогу рабочым сваімі ведамі, а дзяржаве дабрахвотнай працай. Палітычная і эканамічная рэвалюцыі цягнуць за сабою і рэвалюцыю тэхнічную, а гэтаму дапаможа НРУ, даўшы веды рабочаму.

Ад акруговага камітэту КП(б)Б гаворыць Т. Некрашэвіч. Рост эканамічнага добрабыту ў краіне выстаўляе пашыранае запатрабаваньне ў здавальненьні культурных патрэбнасьцяй працоўных мас, якіх дзяржава поўнасьцю здаволіць у даны момант яшчэ ня можа, ня гледзячы на вялікі процант выдаткаў у агульным каштарысе на гэту патрэбу. Тым больш каштоўна дабрахвотная прапанова навуковымі працаўнікамі сваіх ведаў.

Збліжэньне навуковых працаўнікоў з рабочымі масамі тут на занятках у Нядзельным Рабочым Унівэрсытэце дасьць станоўчы вынік для культурнай рэвалюцыі.

Выступаўшы ад акрвыканкому т. Паўлюкевіч адзначыў вялізны рост затрат на асьвету і колькасьць вучэбных установаў, а таксама колькасьць вучняў у параўнаньні з царскім часам па Віцебскай акрузе. Разам з гэтым т. Паўлюкевіч адзначыў адносіны царскай і савецкай улады да Нядзельнага Рабочага Унів.

Ад імя навуковых працаўнікоў выступіў праф. Макарэўскі, сказаўшы, што навуковыя працаўнікі сумленна, як савецкія грамадзяне, выканаюць сваю задачу. Канчаючы прамову ён сказаў: «Таварышы рабочыя! Розьніцы паміж вашай і нашай працай ня будзе, будзьце ўпэўнены, што вы атрымаеце веды».

Прадстаўнік Акрапа т. Заводнік у сваёй прамове заклікае рабочых атрымаць веды для сваёй адказнай працы па будаваньню сацыялізму ў нашай краіне і адзначае, што колькасьць занісаных (да 500 ч.) і тыя сілы, якія ўзялі на сябе працу (працаўнікі высшай кваліфікацыі) па выкладаньню — зьяўляюцца нарукай поспеху працы Нядзельнага Унівэрсы[illegible]

Адчыненьне закончылася прывітаньнем рэктара Унівэрсытэту Алонава і першай лекцыяй прафэсара Шліттэра на тэму «Навука і праца».

Я. Цікавы.

Крэдытаваньне рабочых трэба аднавіць.

Рабочыя і служачыя прадукты першай неабходнасьці вельмі часта бяруць у крэдыт, пагашаючы яго кожнага 15-га і 1-га. Зразумела, цэрабкоп зацікаўлен, каб гэты крэдыт ішоў праз каапэрацыю. Гэтак і практыкавалася, і трэба сказаць, што на дробным крэдыце ў цэрабкопе няма ніякай запазычанасьці.

Раптам Наркамфіну зажадалася затрымаць гэты крэдыт, прычым ён ня выдаў патрэбных для гэтага асыгновак. Цэрабкоп на дзеяньні НКФ падаў жалабу ў Эканамічную Нараду, але пытаньне гэта дасюль там яшчэ не разглядалася.

Мясцкомы натоўпам ідуць у цэрабкоп за дробным крэдытам, а апошні ня мае сілы зрабіць што-небудзь. Рабочыя і служачыя прымушаны крэдытавацца ў прыватных крамках.

Эканамічнай Нарадзе належала-б хутчэй разглядзець гэта пытаньне, бо шкада пакупцоў-працоўных, якія нясуць свае грошы кожнага 15-га і 1-га прыватным крамнікам.

Пытаньне гэта патрабуе якнайхутчэйшага вырашэньня.

Праца сярод батракоў значна палепшылася.

(Астрашынка-Гарадзкі раён, Меншчына).

Доўга па нашым сельсавеце амаль ніякай працы сярод батракоў не вялося, а калі вялася, дык вельмі малая. Сельсавет мала быў зацікаўлен гэтым і мала зварочваў увагі. А, праўду сказаць, іх налічваецца па цэламу сельсавету чалавек прыблізна 80. Але-ж у 1927 годзе праца значна палепшылася і падняла настрой батрацтва. Усе 80 чалавек ахоплены на 100 процантаў дагаворамі. Усе батракі ўзяты на вучот камітэтам сялянскае дапамогі, што дапамагае весьці культурную працу.

Было склікана 5 агульных сходаў, дзе ставіліся пытаньні рознага характару.

45 процантаў уцягнута ў саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых.

Толькі культпраца яшчэ не пастаўлена на належную вышыню. Гэта патрэбна сельсавету нець на ўвазе і павесьці больш шырока культасьветную працу.

Дубраўскі.

Рабочая хроніка.

Сацстрахаваньне сэзонных рабочых савхозаў.

Да гэтага часу сацыяльнае страхаваньне на сэзонных рабочых ня было поўнасьцю распаўсюджана; такім чынам, яны ня мелі магчымасьці карыстацца сац. дапамогай на беспрацоўю, інвалідзнасьці і інш.

ЦК саюзу працаўнікоў зямлі і лесу вынесла пастанову аб неабходнасьці поўнага распаўсюджаньня сац. страхаваньня на рабочых прапрацоўваўшых у савхозах 3 месяцы.

Калі пачне працаваць хлебазавод.

(Гутарка са старшынёю праўленьня МЦРК т. Зынгерманам).

У апошнія часы,—кажа т. Зынгерман,—у горадзе распаўсюдзіліся чуткі, цібы-та новы хлебазавод ня можа і ня будзе працаваць. Усе гэтыя чуткі ня маюць пад сабою ніякай падставы, а зьяўляюцца толькі звычайнымі плёткамі безадказных асоб.

Сутнасьць справы вось у чым. Калі завод быў пушчан да Кастрычнікавых урачыстасьцяй, яшчэ ня была закончана ўстаноўка ацяпленьня ў той часьці заводу, дзе месьць цеста. Калі-ж ударылі марозы, была зроблена спроба ўстанавіць часова жалезныя групкі, але яны аказаліся вельмі нявыгоднымі, і ў памяшканьні было халодна, як у лядоўні. Апроч таго, два нямецкія мацёры праводзілі мантаж барабначнага аддзяленьня і аўтаматычнай вагі. Уся гэта работа праводзілася пры адчыненых вокнах, уздымаючы ў памяшканьнях цэлыя хмары пылу і бруду.

Зусім слушна, што пры такіх умовах нельга было печы, мясіць і расчыняць хлеб ды інш. цеста.

Мантаж барабначнага аддзяленьня будзе хутка закончан, пасьля чаго распачнецца яшчэ мантаж печы па выпечцы дробных цукерных вырабаў. На гэтых днях прыяжджае інжэнэр ад фірмы «Гыдравліка» для ўстаноўкі вялікага катла (адзін з пяці катлоў, якія будуць яшчэ ўстаноўлены). Устаноўка катла прадоўжыцца дзён 20. Такім чынам, у палове студзеня хлебазавод распачне сваю сталую работу па выпечцы хлеба, баранкаў і інш. дробнага мішанічнага печыва.

КАМСАМОЛУ АД ПАРТЫІ.

У 9-ую гадавіну ЛКСМБ—Менскай арганізацыі Ленінскага Камсамолу Беларусі Менскі акруговы камітэт КП(б)Б пасылае шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

9 гадоў Менская арганізацыя камсамолу на чале рабоча-сялянскае моладзі ішла цьвёрдым крокам пад сьцягам Леніна і яго партыі на ўсіх франтох рэвалюцыйнай барацьбы за перамогу рабочае клясы.

Самыя лепшыя камсамольцы ў шэрагах Чырвонае арміі гэраічна змагаліся за Рэспубліку Працы, тысячы камсамольцаў з бальшавіцкім энтузіязмам, выключнай любоўю працавалі на камуністычных суботніках, сотні тысяч камсамольцаў і рабоча сялянская моладзі з вялікаю ўпартасьцю, ініцыятывай і энэргіяй працуюць на прадпрыёмствах па зьнішчэньню прагулаў, уздыму працоўнае дысцыпліны, рацыяналізацыі вытворчасьці; на вёсцы—па палепшаньні гаспадаркі на падставе яе капэраваньня, у горадзе і на вёсцы па ўздыму культурнага і палітычнага ўзроўню рабоча-сялянскае моладзі,—вось асноўныя сьведкі працы камсамолу.

Камсамол энэргічна падтрымліваў партыю пры апошняй барацьбе з нэменшавізмам і сказаў сваё слова партыі,—за ленінізм, паставіўшы сваё выхаваньне на аснове вучэньня Леніна, даўшы рашучы адпор трацкісцкай апазіцыі.

Наперадзе, перад камсамолам стаяць вялікія задачы—удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве і Менская партыйная арганізацыя ўпэўнена, што Менская камсамолія, з усімі стаючымі перад ёю задачамі, справяцца і пераможа ўсе цяжкасьці, якія стаяць на яе шляху з наменшым гэраізмам і ўпартасьцю, як гэта было за мінулыя 9 гадоў.

НЯХАЙ ЖЫВЕ МЕНСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛУ БЕЛАРУСІ!

Менакругком КП(б)Б.

Перавыбары ў каапэрацыі.

Беднота дала арганізаваны адпор заможным

Бабруйск. У сучасны момант перавыбарная кампанія спажывецкай каапэрацыі ў самым разгары і ўжо маюцца папярэднія зьвесткі аб тым, як праходзіць гэтая праца на вёсцы. Для правядзеньня перавыбараў акрсаюзам спажывецкай каапэрацыі па мейсцы пасылаюцца прадстаўнікі.

Удзел пайшчыкаў у перавыбарных сходах спажывецкай каапэрацыі дасягае ў сярэднім 40,5 проц. Апрача пайнікаў на сходах прысутнічае значная колькасьць і непайнікаў.

Перад перавыбарна-справаздачнымі сходамі праводзяцца сходы беднаты; яны абгаварваюць свае кандыдатуры і арганізована праводзяць іх у кіраўнічыя органы каапэрацыі.

Улічваючы малыя фонды ўласных капіталаў таварыстваў сходы ўпаўнаважаных у некаторых мясцох акругі выносяць пастановы аб папаўненьні паёў да 7 руб.

Кулацка-заможніцкія групіроўкі ў сваю чаргу рыхтаваліся да перавыбараў праўленьняў таварыстваў. У некаторых мясцох (Плесы, Вортнікі, Бабруйск. р-ну) заможнікі спайвалі пайнікаў, каб мець магчымасьць напасьці ў кіраўнічыя органы спажывецкіх таварыстваў. У некаторых мясцох гэтыя-ж групы крыкам і лямантам імкнуліся перашкодзіць працы перавыбарных сходаў.

Але беднота дала дружны і арганізаваны адпор усім гэтым кулацкім спробам. Аб гэтым, як ня трэба лепей, гавораць лічбы абраных у кіраўнічыя органы таварыстваў.

Так, напрыклад, па 7 таварыствах, у якіх праведзены перавыбары у склад новых праўленьняў увайшло 10 беднякоў, 5 сераднякоў, 2 рабочых і 4 служачыя. У рэвізійныя камісіі гэтых-жа таварыстваў увайшло 4 беднякі, 4 сераднякі і г. д.

Перавыбары спажывецкай каапэрацыі паказваюць рост аўтарытэту партыі на вёсцы. Аб гэтым гавораць таксама лічбы: па 7 спажывецкіх таварыствах з агульнага ліку 21 сябра праўленьня 10 зьяўляюцца партыйцамі.

Такімі асноўнымі момантамі характарызуюцца сёлетнія перавыбары спажывецкай каапэрацыі на акрузе.

А. Дамброўскі.

Да выбараў аднесьліся сур'ёзна.

4-та сьнежня адбыўся агульны сход упаўнаважаных Самахвалавіцкага спажывецкага т-ва. На сходзе прысутнічала з 138 чал. упаўнаважаных 80 чал.

З дакладу старшыні праўленьня ня відаць было, што каапэратыў працу вёў добра. На заданыя пытаньні дакладчык ня мог адказаць і прышлося другім таварышам адказаць за яго.

У спрэчках самі пайшчыкі лепш ахарактарызавалі працу каапэрацыі. Культпрацы і працы па каапэраваньню каапэратыў амаль што ня веў, у выніку чаго прырост пайшчыкаў невялікі, усяго 72 чал. Фонд на каапэраваньню бяднейшага насельніцтва ў ліку 800 р. ніяк не маглі скарыстаць, і дзе-ж яго было скарыстаць, калі ня было вучоту беднаты. Зьніжэньне цэн прайшло за кошт гандлёвых прыбыткаў, ня гледзячы на тое, што месяцы чатыры таму назад была праведзена рацыяналізацыя апарату, а выдаткі на ўтрыманьне служачых не скараціліся. Адпала і марачная сыстама, аб якой пры ўвядзеньні шмат гаварылася. А чаму? Ды проста, прыказчык без усялякай падставы стаў казаць пайшчыкам:

—Не бярыце, марак, бо ўсёроўна па іх нічога не атрымаеце.

Вядома, пайшчыкі і ня сталі браць гэтых марак, і запісі ў кніжцы заборнай таксама не рабілася.

Прыбытак усё-ж-такі маецца ў суме 293 р.

Процант налажэньня дасягае да 40-50 проц. на некаторыя тавары першай неабходнасьці.

Праўда, будуецца сваё памяшканьне, у якое пазіны былі перайсьці ў дзень 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі, але яшчэ і да гэтага часу сабіраюцца, як мокрае гарыць.

Да перавыбараў пайшчыкі аднесьліся ўважліва і абралі добры склад праўленьня з 3 чал. і 2-х кандыдатаў. Можна спадзявацца, што новы склад праўленьня і рэвізійная камісія цалкам на 100 проц. выканаюць наказ пайшчыкаў, увушоўны ў новае сваё памяшканьне да новага 1928 году.

Пайшчык.

М. Самахвалавічы, Меншчына.

Роўналежнасьць шкодзіць працы*).

На рубяжы трэцяга пяцігодзьдзя савецкае юстыцыі неабходна паставіць пытаньне аб выразнасьці кіруючых функцый між НКЮ, як адміністрацыйным апаратам, і Вярхоўным Судом, як органам, кіруючым судовай практыкаю і палітыкаю, бо кожнае вызначэньне году ёсьць палітычны акт, а Вярхоўны Суд зьяўляецца практычным і палітычным кіраўніком гэтае працы ў адносінах да судоў.

Тэарэтычныя разгалосьці ў адносінах кіраўніцтва судамі мала па малу асьвятлялі і востра выявіліся на рубяжы 1927 году ў часе праводзімай рацыяналізацыі апарату НКЮ, па што таксама была зьвернута ўвага грамадзкіх арганізацый, неаднолькава зазначаючых па роўналежнае кіраўніцтва судамі па судовай лініі, выходзячых адначасова ад Вярхоўнага Суду і НКЮ. Чым жа кіраваліся суды? Суды кіраваліся і павінны былі кіравацца тлумачэньнямі па судовай лініі, якія выходзяць ад Вярхоўнага Суду. Аднак, праводзімая рацыяналізацыя пажаданых вынікаў не дала, бо замест Аддзелу Судаўпарадкаваньня НКЮ арганізавана судовая інспэкцыя, якая выконвае тыя-ж функцыі таго-ж аддзелу, толькі пад іншаю назваю.

Гэтае пытаньне аб роўналежным кіраўніцтве судамі таксама выявілася і ў справаздачы Вярхоўнага Суду Прэзыдыуму ЦВК'у БССР, які ва ўхвалены рэзалюцыі па справаздачы прапанаваў НКЮ і Вярхоўнаму Суду ў 2-х месячны тэрмін распрацаваць праэкт мерапрыёмстваў па зьнішчэньні роўналежнасьці ў кіраўніцтве судамі.

Наркамюст і Вярхоўны Суд вядуць вельмі натрэбную працу ў судовай практыцы, але разьмеркаваньне гэтае працы між ім настолькі закасьнела, што зьяўляецца перашкодаю жыцьцёвым патрабаваньням савецкае юстыцыі, законадаўства якой шчыльна зьвязана з эканамічным разьвіцьцём нашай краіны і пераходам да індустрыялізацыі.

Вярхоўны Суд займаецца важнейшай, кіруючай судовай працай-касацыяй і рэвізій судовых прысудаў і пастаноў акруговых судоў па скаргах асобных грамадзян. Такіх скаргаў у Вярхоўным Судзе БССР бывае да 2500 у год, прычым па кожнай скарзе прысылаюцца ў суд усе арыгіналы матар'ялаў кожнае судовае справы, якія потым дакладна вывучаюцца, абмяркоўваюцца ў спэцыяльных калегіях цывільных ці крымінальных, а таксама пракурорскім нагляды, пасьля чаго Вярхоўны Суд пастанаўляе аб правільнасьці ці памылковасьці прысуду акруговага суду, робіць свае папраўкі ў санкцыю ці зусім адмяняе прысуд і варочае ў акруговы суд на новы, паўторны разгляд. Той-жа самы парадак існуе і ў акруговых судох у адносінах да прысудаў народных судоў; як у Вярхоўным, так і ў акруговых судох гэты масавы разгляд спраў стварае вялікі практычны вопыт, накапляе значныя і даволі дакладныя даныя аб працы кожнага падсправаздачнага суду і нават асобных судзьдзяў і пракурораў. Акруговы суд выкарыстоўвае гэты вопыт для вучоту кваліфікацыі народных судоў сваёй акругі і, маючы адміністрацыйныя правы, такім чынам зьяўляецца кіруючым цэнтрам па правядзеньню судовае патітыкі ў акрузе, адказным за падначаленыя яму акругі. Зусім іншае мы бачым у Вярхоўным Судзе БССР. Вярхоўны Суд ня мае гэтых правоў, функцый акруговых судоў і, значыцца, ня можа непасрэдна ўплываць на асабовы склад правяраемых судоў і не выкарыстоўвае свайго касацыйна-рэвізійнага вопыту, якога ў Вярхоўным Судзе ў шмат разоў больш, чымся ў любым акруговым.

Цяпер неабходна спыніцца на структуры НКЮ для таго, каб мець магчымасьць параўнаць працу гэтых двух органаў. НКЮ складаецца з 2-х галоўных частак: 1) пракуратуры, 2) судовае інспэкцыі.

Аддзел пракуратуры ў НКЮ ёсьць сапраўды адзіна жывы і неабходны. Ён ажыцьцяўляе нагляд за законнасьцю ў рэспубліцы, а таму павінен быць незалежным ад суду, цэнтралізаваным і адмежаваным ад кіраўніцтва судамі. Пракурор, як казаў Уладзімір Ільліч, «мае права і абавязан рабіць толькі адно: сачыць за ўстанаўленьнем сапраўднага аднастайнага разуменьня законнасьці па ўсёй рэспубліцы, ня гледзячы на аніякія мясцовыя разьвіцьці і наперакор якім бы там ні было мясцовым уплывам. Адзінае права і абавязак пракурора перадаць справу на разгляд суду».

Таму, чым менш пракурор будзе нагружан усякай лішняй працай, тым лепш ён выканае свой просты абавязак; а між тым пракурор рэспублікі адначасова зьяўляецца і Народным Камісарам Юстыцыі, г. зн. асобай кіруючай судамі (а ня толькі пракурорам) у адміністрацыйнай адносіне.

Гэта трэба аддзяліць, выдзеліць пракуратуру ў чыстым выглядзе, павялічыўшы тым самым яе просты ўплыў усюды, дзе гэта патрэбна ў сэнсе лепшага нагляду за законнасьцю, бо існуючая да гэтага часу дуалістычная сыстэма кіраўніцтва адбівалася і будзе адбівацца на працы судовых органаў, калі яна ня будзе зьнішчана.

А наша сацыялістычнае будаўніцтва можа і будзе з посьпехам разьвівацца пры абавязковай дапамозе яму з боку законадаўства, для чаго неабходна правільная пабудова судовых органаў, г. зн. пракуратуры і суду, пракуратуры, ажыцьцяўляючай нагляд за законнасьцю суду, укараняючай яе ў сьвядомасьць шырокіх мас.

Адгэтуль ва ўсёй шырыні ставіцца пытаньне аб законнасьці ў такой пастаноўцы, у якой ставіў гэта пытаньне Ленін, зазначаючы на тры ўмовы, неабходныя для ажыцьцяўленьня законнасьці, а менавіта: адзінства законнасьці, адзінства яе разуменьня, адзінства яе правядзеньня. «Законнасьць павінна быць адзінаю», падкрэсьлівае ён у лісьце да пракуратуры.

Судовая інспэкцыя займаецца вучотам асабовага складу акруговых судоў, якіх па БССР маецца 8, яго пераразьмеркаваньнямі, звальненьнямі і інш., а таксама рэвізіямі і інструктаваньнем судовых месцаў. Праца гэтая праходзіць бяз усякага асьведамленьня аб галоўнай дзейнасьці сваіх падначаленых—судовай інспэкцыі. Рэвізоры і інструктары, прыяжджаючы на месцы, цікавяцца толькі гаспадарчай часткай акруговага суду, яго фінансамі, агульным парадкам, перагружанасьцю працаўнікоў, натарыятам і інш., ня ўнікаючы і ня маючы магчымасьці ўнікнуць у судовую працу рэвізуемых. Для пасьпяхоўнасьці рэвізіі неабходна камандыраваць члена Вярхоўнага Суду, сыстэматычна назіраючага за справамі данага акруговага суду; тады рэвізія робіцца поўнай і мэтазгоднай, зьбірае сапраўды патрэбны матар'ял і з большай карысьцю, (па водгуках з месцаў) інструктуе акруговых судзьдзяў, даючы паказаньні па шматлікіх спрэчных ці кепска зразумелых пытаньнях. Але ў такіх рэвізіях, як паказала практыка, інструктар з Наркамюсту зьяўляецца проста не патрэбным.

Кіраўніцтва судамі з боку Наркамюсту ня можа быць названа палітычным, як у сэнсе наданых яму на закону правоў, так і маючайся практыцы.

Палітыка судовае працы выяўляецца ў прысудах і пастановах па крымінальных і цывільных справах, якія праходзяць праз савецкі суд, які ў гэтых сваіх пастановах ні ў якім выпадку ня кіруецца якімі-небудзь дырэктывамі НКЮ раней усяго таму, што дырэктыў гэтых няма і ня можа быць, бо па закону суд (адзін судзьдзя і 2 засядацелі з рабочых і сялян) ухваляюць прысуд па сумленьню і ўнутранаму перакананьню, абгрунтаванаму на даных, прайшоўшых перад судом.

Адзінае кіраўніцтва ў гэтай справе ажыцьцяўляе касацыйная інстанцыя, уносячы папраўкі ў прысуд і адмяняючы іх. Ніякіх дырэктыў ад НКЮ не атрымлівае і гэта інстанцыя, г. зн. Вярхоўны Суд цалкам і поўнасьцю самастойны ў пастановах кожнае з 2500 разгледжаных спраў. Вярхоўны Суд і вядзе такім чынам палітычнае кіраўніцтва, ажыцьцяўляючы агульную палітычную лінію. Усе справы ў Вярхоўным Судзе разглядаюцца з удзелам пракуратуры, а ў пленуме яго ўдзельнічае абавязкова пракурор,—ці яго намесьнік, маючы такім чынам магчымасьць наглядаць за законнасьцю гэтых пастаноў. Усякую пастанову Вярхоўнага Суду ён можа апратэставаць як у пленум Вярхоўнага Суду, так і ў Прэзыдыум ЦВК'у. Уплыў пракурорскага нагляду ў судовай палітыцы тут поўнасьцю забясьпечаны. Але, аднак, гэта адносіцца да пракуратуры, а не да НКЮ.

У мэтах адзінства судовага кіраўніцтва патрэбна зьнішчэньне двацэнтрыя і роўналежнасьці ў працы. Патрэбна ўсю судовую частку згуртаваць у Вярхоўным Судзе, а пракурорскую—у пракуратуры. Новая арганізацыя судовага кіраўніцтва і пракуратуры будзе больш простая, ясная і прыцынова вытрыманая, чымся зараз, а практычна больш працаздольная і апрача таго ў шмат разоў таньнейшая.

Варашылаў.

*) Артыкул т. Варашылава гэтаксама як артыкул т. т. Канокопіна і Зыбко (гл. Сав. Беларус." № 285) друкуецца ў падтэку абгавораньня.

Што будзе зроблена па земляўпарадкаваньні ў 1927—28 годзе.

У працягу 1927-28 г. па земляўпарадкаваньні мае быць праведзена наступнае:

Надзялен

Як менскія рабочыя адгукнуліся на пазыку індустрыялізацыі.

Ужо ёсьць пэўныя даныя, якія даюць магчымасьць падвесьці вынікі кампаніі распаўсюджаньня пазыкі індустрыялізацыі, падрахаваць, як рабочыя і служачыя Менскае акругі адкліканулися на лёзунг партыі і савецкага ўраду. Кампанія разгортвалася ў момант, калі скаціўшаяся ў меншавіцкае балота апазіцыя вуснамі Зіноўева заявіла аб тым, што «дзякуючы палітыцы ЦК, рабочая кляса да ЦК адносіцца прахладна», што «матар'яльнае становішча рабочае клясы не паляпшаецца».

Кожнага працоўнага цікавіць пытаньне, ці справіліся менскія рабочыя в задачай, якую ставіла перад імі партыя ў галіне распаўсюджаньня пазыкі індустрыялізацыі краіны.

У адказ на гэта пытаньне прыводжу некалькі лічбаў.

Меркавалася па Менскай акрузе правесьці падпіску на 550000 руб., рэалізавана з 1 верасьня да 23 лістапада 759600 руб.; гэта значыць —138,11 проц. заданьня. З іх у самым горадзе —521455 і на перыферыі акругі—238145, з якіх найбольшы процант падае на рабочых Барысаўскіх прадпрыёмстваў. Менскія рабочыя і служачыя ў належнай меры ацанілі важнасьць гэтае пазыкі і тую задачу, якую ставіла перад імі партыя і ўрад, уясьнілі, што наша краіна, у якой рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будуе і пабудуе сацыялізм, для сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе сродкаў, і што гэтыя сродкі краіна здолее атрымаць са зьберажэньняў працоўных. Аб гэтым гаворыць тое, што пазыкай індустрыялізацыі абхоплены амаль што ўсе рабочыя і служачыя акругі (85-90 проц. усіх рабочых і служачых).

Паасобныя рабочыя падпісваліся на месячны заработак, а часта былі і такія выпадкі, калі хатняя працаўніца, атрымоўваючы 10-15 руб., падпісвалася на 30-40 руб. Вывад можа быць толькі адзін, які напрашваецца сам сабою в прыведзеных вышэй лічбаў: задачу, якая перад намі стаяла, мы выканалі і выканалі яе дрэнна, прычым па суме, рэалізаванай у БССР, менскія рабочыя занялі першае месца і гэтым самым зрабілі крок наперад па шляху будаўніцтва сацыялізму.

П. Тамашэўскі.

КАРЭСПАНДЭНТЫ ЗА ЗІМОВАЙ ПРАЦАЙ.

Гурток—база студкораўскага руху.

(Водгук на артыкул «Сярод студкораў»).

Студкораўскі рух з кожным годам павялічваецца і ў апошні час шырока ахапіў усе нашы вышэйшыя навучальныя установы, тэхнікумы і рабфакі. Колькасны рост студкораў высоўвае пытаньне аб арганізацыйным афармленьні і паглыбленьні студкораўскага руху, а таксама прымушае адшукаць мэтады працы сярод студкораў, як шэфнага актыву, які хутка рэагуе і крытычна адносіцца да розных пытаньняў студэнцкага жыцьця.

Па сутнасьці, студкораўскі рух зьяўляецца крылом рабселькораўскага руху (праўда, да апошняга часу слаба з ім зьвязана) і на гэтаму ён павінен ісьці па таму-ж шляху і прытрымлівацца асноўных прынцыпаў рабселькораўскага руху—гэта: масавасьць, дабрахвотнасьць і самадзейнасьць. Відома, што спэцыфічныя ўмовы студэнцкай грамадзкасьці не дазваляюць цалкам перанесьці задачы, пляны і мэтады працы сярод рабселькораў у студкораўскі рух,—ды гэта на было-б і карысна.

Але ці добра зрабілі студкоры правгасу БДУ, калі яны адмовіліся сёлета ад арганізацыі студкораўскага гуртка? Ці запраўды не хапае цікавых пытаньняў, якія магчыма абгаварваць на занятках гуртка? Бязумоўна, не! Ад гэтым сьведчыць вопыт цэлага шэрагу студкораўскіх гурткоў. Студкораўскі гурток павінен заняць і займае галоўнае месца ў працы сярод студкораў; гурток—база студкораўскага руху. Трэба толькі належным чынам арганізаваць яго працу, без фармальнасьцяў, празьмернай тэарытычнасьці, шаблёну і г. д., і тады ён будзе цікавіць масу і будзе жыцьцёвым.

Абгаварваньне пытаньняў аб валенцінамі насьценгазэты крытычны разгляд выпушчаных нумароў насьценгазэты як сваёй навучальнай установы, гэтак і другой, разбор артыкулаў і заметак, абмеркаваньне дакладаў па галаўнейшых пытаньнях студэнцкага жыцьця і г. д.—усё гэта можа і павінна скласьці праграму працы студкораўскага гуртка.

Парэшце, чаму на занятках гуртка не заняцца дэтальным вывучаньнем рабселькораўскага руху, кіраўніцтва ім, мэтодыкай працы рабселькораўскіх гурткоў (асабліва вывучэньнем матар'ялаў III-й Усесаюзн. нарады рабселькораў), чаму не пазнаёміцца і разабрацьчасопісь «Рабоча-Крестьянский Кореспондент»), якую між іншым мала хто на толькі з студкораў, але і з працаўнікоў рэдкалегіі рэдае; гэта зрабіць неабходна і ў першую чаргу, каб бліжэй падыйсьці да агульнага рабселькораўскага руху, каб прыняць актыўны ўдзел у ім. Запраўды, у студкораўскім гуртку гэтакім чынам магчыма падрыхтаваць студкораў, якія-б маглі быць накіраваны на прадпрыёмствы для кіраўніцтва рабкоўскімі гуркамі і наогул дапамагаць насьценгазэце і працы сярод рабкораў. Гэтакі від грамадзкай працы студэнцтва трэба шырока разгарнуць.

Гэта мерапрыёмства можа быць праведзена, а таксама насьценгазэта будзе мець належны грунт, студэнцкае жыцьцё будзе добра высьвятляцца ў нашым агульным партыйна-савецкім друку, будзе выяўляцца сьвядомы актыў з ліку студкораў—толькі тады, калі будзе арганізован і будзе добра працаваць студкораўскі гурток.

Т. Гурвіч.

Калі чытаць—дык чытаць да канца.

У № 270 ад 29-га лістапада г. г. зьмешчана заметка пад загалоўкам «Для каго пішуць», у якой т. Федарычык адзначае хваробны бок насьценнай газэты Горацкага РВК «Савецкі гаспадар» № 2.

Адказваючы на гэту заметку, рэдкалегія шкадуе, што аўтар заметкі не пацікавіўся ўсім зьместам гэтай газэты, а толькі зьвярнуў увагу на адзін з лёзунгаў, які запраўды напісан кепска.

Тав. Федарычык кажа, што рэдактары газэты сядзяць недзе здаволеныя і спадзяюцца на тое, што газэту іх чытаюць масы, у чым ён бязумоўна ня праў і вось чаму: рэдакцыя мела гэта на ўвазе, але, дзякуючы таму, што месца для гэтага лёзунгу было мала, ён так кепска выглядае.

Побач з гэтым трэба заўважыць, што газэта напісана выразна, надрукавана нават на машынцы і сялянства цікавіцца гэтай газэтай, бо яна ахоплівае ўсе бакі сельскае гаспадаркі і зьяўляецца для сялян зразумелай.

Трэба нажадаць тав. Федарычыку, каб ён ня лічыўся з часам і не хапаўся толькі за адны лёзунгі, а чытаў бы ўсю газэту і рабіў вынікі па зьместу газэты, каб такім чынам даць здаровую крытыку ў далейшай працы рэдкалегіям насьценгазэт.

Рэдкалегія.

Вывучаем свой край.

ЛЯДНЕНСКАЕ КРАЯЗНАЎЧАЕ Т-ВА.

У раёне т-ва мае 6 сельсавецкіх ячэек. Т-ва сабрала шмат рознага фольклёрнага матар'ялу. Апрацаваны і прыведзены ў парадак каля 1000 прыпевак, некалькі сот загаворак, загадак і замоў.

Шмат што зроблена ў галіне зьбіраньня слоў жывой беларускай мовы. Сабрана каля 500 узораў розных тканін і вышывак. Т-ва выправіла 1-вёрстную карту раёну. Зпойдзены 2 наркоўныя летапісы і рэвізкія сьпісы даюць магчымасьць вывучаць гісторыю раёну.

ЦЕРАЗ ПЕНЬ—ЦЕРАЗ КАЛОДУ.

Гэту пагаворку можна дачасаваць да працы Дуброўненскага краязнаўчага т-ва, якое сьпіць непрабудным сном. Т-ва, праўда, набыло шафу для складаньня розных папер, але, як відаць яно мае намер пакінуць гэту шафу ў «навучаньне» патомным. Але, калі пуста ў галаве, то і архівы будуць пустыя, і патомкі так і не пазнаюць сваіх прагных да вывучэньня краю продкаў.

Ня думайце, што ніхто ня будзіў ад сну нашых дасьледчыкаў; не адзін і ня два разы прыяжджалі ў Дуброўну прадстаўнікі акруговага краязнаўчага т-ва, але ўсё дарэмна; праца ня рухаецца з месца.

АРГАНІЗАЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЭЮ.

Коханаўскае краязнаўчае т-ва вядзе галоўным чынам, зьбіральніцкую працу. Т-ва імкнецца прадставіць свой раён у музэйных экспанатах. РВК аддаў пад музэй спэцыяльнае памяшканьне, якое ўжо адраманцавана.

Апрача экспанатаў, т-ва сабрала розныя дыяграмы з выставак, прысьвечаных дзесяцігодзьдзю Кастрычніковай рэвалюцыі, статыстычныя даныя і лічбы вваротаў гандлёвых установ, запісы аб паўстаньні 1863 г., два апісаньні вёсак і інш.

Т-ва мае ў раёне 5 краязнаўчых гурткоў, праз якія яна зьбірае краязнаўчы матар'ял з самых глухіх куткоў.

СЯЛЯНЕ-ДАСЬЛЕДЧЫКІ.

Талачынскае краязнаўчае т-ва аб'яднае звыш 250 сярбоў; пераважная маса сяброў упаходзіць у краязнаўчыя гурткі. Усё, што зроблена т-вам, далі, галоўным чынам, вясковым гуркі. У некаторых гурткох сябрамі зьяўляюцца нават сялянкі, якія самі прыходзяць у гурткі, каб там запісалі розны фольклёрны матар'ял. У выніку працы вясковых гурткоў удалося скласьці апісаньне цэлага раёну.

Т-ва правяло значную працу ў галіне вучоту помнікаў старажытнасьці, зьбіраньня фольклёрнага матар'ялу і вывучэньня карысных выкапняў. Знойдзены фарбы охры, залежы торфу, блакітная мінэральная фарба і інш.

Т-ва ўзяло на вучот рэдкую зьвярыну: ласёў, дзікоў і інш, але талачынскі саюз паляўнічых нядбайна адносіцца да аховы рэдкіх зьвяроў і аднаго лася ўжо нехта забіў.

Хроніка.

Усе сілы на ўзьняцьце сельскай і лясной гаспадаркі.

Закончылася 3-я канфэрэнцыя спэцыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі, якая прайшла вельмі актыўна.

Па справаздачах бюро сэкцый і Акрэва разгарнуліся шырокія спрэчкі. Дэлегаты гаварылі аб неабходнасьці яккутчэй зямляўпарадкаваць і перавесьці нашу вёску на шматпольле, палепшыць жывёлагадоўлю, мэліяраваць невыкарыстаныя зямельныя плошчы, як арганізаваць ласную гаспадарку, каб павялічыць яе прыбытковасьць бяз зьнішчэньня лесу, як найлепш здаволіць патрэбы насяленьня і прамысловасьці ў драўніне, як перайсьці на агнятрывалае будаўніцтва ў вёсцы, як увязаць працу спэцыялістаў і нізавых мясцовых органаў улады паміж сабою і ўпарадкаваць узаемаадносіны паміж імі.

Вельмі актыўна абгаварвалася пытаньне і аб агульна-грамадзкай працы спэцыялістаў на вёсцы.

Канфэрэнцыя абгаварыла і тое, як перападрыхтаваць і павысіць адукацыю, а таксама палепшыць матар'яльна бытавыя ўмовы спэцыялістаў.

Па ўсіх гэтых пытаньнях дэлегаты в месц унесьлі шмат канкрэтных прапаноў.

Спрашчэньне судова-сьледчай і пракурорскай працы.

Распрацаваньня НК РСІ СССР прапанованы аб спрашчэньні працы судовых, сьледчых і пракурорскіх органаў прапрацоўваюцца органамі НКЮ і НК УС БССР і ў бліжэйшым часе будуць канчаткова праведзены ў жыцьцё.

Ажыцьцяўленьне гэтага дасьць значнае палепшаньне, разгрузку работы паказаных органаў і зьменшыць тэрміны прахаджэньня спраў.

Для лепшай прапрацоўкі і выкарыстаньня вопыту візавых работнікаў НК РСІ і НКЮ склікаюць на 28 сьнежня нараду Менскіх гарадзкіх судова-сьледчых работнікаў, работнікаў пракурорскага нагляду, міліцыі і папрачных дамоў, з удзелам партыйных і прафэсыянальных арганізацый.

БССР памагае будаваць „Днепрастрой".

З лясоў БССР для „Днепрастрою" адпушчана 50.000 кубічных мэтраў драўніны. Лесбелу даручана распрацаваць гэтую драўніну і падрыхтаваць для здачы „Днепрастрою".

Падрыхтоўка да вясеньняй пасяўной кампаніі.

Цэнтраземсклад атрымаў дадаткова 10.000 руб. на закупку сельска-гаспадарчых машын, якія да вясеньняй пасяўной кампаніі будуць разьмяркованы па акругах.

Як праходзіць школьны перапіс у Менску.

Падрыхтоўка да перапісу распачалася яшчэ з 7-га сьнежня, калі пры Акрэва адбылася нарада загадчыкаў культасьветных установ, якія падлягаюць перапісу.

Па гэтай нарадзе прапаўнікі акруговага статыстычнага бюро праінструктавалі загадчыкаў установ, як весьці працу па перапісу, і забясьпечылі іх патрэбнай колькасьцю бланкаў. Да працы на правядзеньні школьнага перапісу прыцягнуты гарадзкія настаўнікі. Перапіс распачаўся 14 сьнежня і праходзіць у нармальных умовах. Усе матар'ялы перапісу будуць перададзены для апрацоўкі ў акрстатбюро.

1000 сэпаратараў для Беларусі.

НК Гандлю СССР адпусьціў для БССР на 1927-28 год 1000 сэпаратараў рознай велічыні. Сэпаратары будуць разьмяркованы па акругах праз с.-г. гандлёвыя арганізацыі.

Пашырэньне Гомельскага заводу „Пралетары".

У зьвязку з рацыяналізацыяй значна пашыраецца Гомельскі чыгунна-ліцейны завод „Пралетары". Гомельскаму АВК даручана далучыць да пляну заводу плошчу чатырох пабочных дамоў.

Новы загадчык Галоўліту.

На пасаду загадчыка Галоўліту Беларусі прызначан тав. Я. Я. Яншэвіч, які ўжо прыступіў да працы.

ВЫНІКІ ТОРФАРАСПРАЦОВАК ПА МЕНШЧЫНЕ ЗА 1927 г.

Па Меншчыне як тарфянымі таварыствамі, так і розным арганізацыямі за 1927 г. здабыта 143242 куб. мэтраў торфу, між тым як у мінулым годзе было здабыта 79779 куб. мэтр.

У параўнаньні з 1926 г. торфу сёлета здабыта больш на 80 проц., але гэтага яшчэ замала для забесьпячэньня насельніцтва палівам.

Галоўнымі загатавіцелямі торфу былі сялянскія тарфяныя таварыствы, лік якіх в кожным годам павялічваецца. Так, у 1925 г. іх было 4, у 1926 г. арганізавалася 22 новыя і ў гэтым годзе—34, а ўсяго зараз у акрузе—60 таварыстваў. Усімі таварыствамі сёлета распрацавана 55995 куб. мэтраў торфу, у два разы болей, чым у 1926 г.

Побач з трафянымі распрацоўкамі сёлета праведзена вялікая праца на абсьледаваньні балот. Напершае, дэтальна абсьледавана 5485 гэктараў балот, падрутое, праведзена рэкагнасцыраваньне абсьледаваньне 11500 гэкт., з якіх 11000 прыпадае на Судабойскі тарфяны масыў у Смалявіцкім і Барысаўскім раёнах. Трэба сказаць, што да гэтага году мы ня ведалі аб тарфяных багацьцях акругі. Сёлета праведзена аграмадная работа на высьвятленьні ўсёй плошчы тарфяных балот Меншчыны. У выніку гэтага высьветлілася, што тарфяныя балоты складаюць плошчу ў 72.317 гэктараў з запасам торфу-сырцу ў 1.445.280.000 куб. футаў.

Да важных работ бягучага году можна аднесьці і тое, што прароблена на багданаўскай вопытна-паказальнай станцыі, а імянна: прарыта магістральная канава працягам 1278 мэтраў, пабудаваны мост і грэбля і інш.

У заключэньне неабходна сказаць, што торфараспрацоўкі паступова маханізуюцца. Сёлета праца вялася з машынамі, набываецца трактар і новыя машыны.

Багацьце, якое ляжала стагодзьдзямі амаль некрануты, зараз пачынае прынасіць вялікую карысьць у гаспадарцы рабоча-сялянскай дзяржавы, а разам з тым дае магчымасьць захаваць тысячы дзесяцін лесу.

Усебеларуская нарада акруговых інспэктароў па ўсеагульным навучаньні.

15-га сьнежня ў Наркамасьветы распачалася Усебеларуская нарада акруговых інспэктароў па ўсеагульным навучаньні. Нарада разглядзела пытаньні аб прынцыпах перааранкоўкі пляну ўсеагульнага навучаньня, водгук даных дэмаграфічнага і школьнага перапісу, інструкцыю для складаньня тэрытарыяльнага пляну ўсеагульнага навучаньня і інш. Нарада працягнецца некалькі дзён.

Склад праўленьня Вячэрняга Рабочага Унівэрсытэту.

Калегія Наркамасьветы БССР зацьвердзіла наступны склад праўленьня Вячэрняга Рабочага Унівэрсытэту: загадчык унівэрсытэту—тав. Мікуліцкі, намесьнік і загадчык навучальнай часткі—тав. Ошараў, прадстаўнік Белдзяржунівэрсытэту—праф. Пічэта, прадстаўнік сэкцыі навуковых працаўнікоў—тав. Выдра.

Выпускі з С.-Гасп. АкадэміІ.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла рабіць выпускі студэнтаў з Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі Сельскай і Лясной Гаспадаркі па сэсіях—вясной і ўвосень.

Колькі газэт чытаецца ў Беларусі.

Водгук даных Галоўпалітасьветы, па БССР выпісваецца насельніцтвам і ўстановамі 89.787 экз. розных газэт. Апрача таго, па ўсіх палітасьветах і іншых установах ў 1927 годзе выпушчана 7.080 насьценных газэт.

200.000 руб. на набыцьцё жывёлы для савхозаў.

Белсельбанк адпусьціў Белсельтрэсту 20.000 руб. крэдыту на набыцьцё рагатай жывёлы для савецкіх гаспадарак.

Забесьпячэньне статорганаў арыфмомэтрамі.

Цэнтральная Статыстычная Ўправа БССР атрымала з Масквы 17 арыфмомэтраў, частка якіх разьмяркована па акругах. Зараз у статустановах Беларусі ўжо ёсьць ад 50 арыфмомэтраў.

Забарона вывазу драўніны.

Каб забясьпечыць сырэвінай сярніковую і папяровую прамысловасьці, Эканамічная Нарада забараніла вывяз з БССР асіны і пяргольцу (адборная яліна).

Барацьба з эпідэміяй водры.

Па вестках Нар. Кам. Аховы Здароўя, у Полацкай, Аршанскай і Менскай акругах распаўсюджваецца эпідэмія водры. Для барацьбы з гэтай эпідэміяй у Полацкай і Аршанскай акругах ужо адчынены ў бальніцах водравыя аддзяленьні. Апроч гэтага ў г. Воршы Дзяржаўны Настэраўскі Інстытут камандыруе ўрача-спэцыяліста для правядзеньня прынцыпак супроць водры.

Дапамога беднаце.

Штомесячна Менскі акр. аддзел сацыяльнай забясьпекі выдае дапамогі неарганізаванай беднаце: 362 чал.—на 3 руб., 67 ч.—на 4 р. 50 к., 4 чал.—на 7 р. і, апрача гэтага, выдаецца штомесячна звыш 200 р. выпадковай дапамогі.

250.000 кос для Беларусі.

Наркамгандаль СССР зрабіў разьмеркаваньне кос сакзснай вытворчасьці 1927-28 году, прычым для БССР вызначана на бягучы аперацыйны год 250.000 штук кос.

Звароты Белмэдгандлю павялічваюцца.

Звароты Белмэдгандлю в кожным годам узрастаюць. Так, у 1925-26 г. агульная сума звароту Белмэдгандлю з яго прадпрыёмствамі раўнялася 1.735.553 руб., а ў 1926-27 аперацыйным годзе агульная сума звароту дасягнула 2.471.109 р.

Чаму такая недарэчнасьць?

Ня вельмі даўно на Савецкай вуліцы быў магазын Чырвонага Крыжу. На гэтым самым месцы цяпер другі магазын, пыгожа ўбраны каляровымі шыльдамі: „Магазын акруговага ўпаўнаважанага ЦК Дапамогі Дзецям".

Пасьля таго, як Гарсавет абсьледаваў магазын Чырвонага Крыжу, апошні неўзабаве быў ліквідаваны, бо для гэтага было аж занадта падстаў.

— Ма'быць месца, дзе знаходзіцца магазын, недарэчнае і таму тут заўсёды бываюць недарэчнасьці,—кажа прыказчык на запытаньне. Чаму ў вас такая дарагая ікра"?

А яна такі запраўды дарагая. Кілёграм кетавай ікры ў гэтым магазыне каштуе 5 р. у той час, як у ЦРК такая-ж ікра каштуе толькі 2 р. 40 к.

Пачатак працы магазыну вельмі недарэчны. Невядома, які будзе канец.

Эса.

МАЦНЕЕ СУВЯЗЬ З ПАДШЭФНАЙ ВЁСКАЙ.

(Ячэйка ТДА-Авіяхіму БДУ).

Вайсковая справа ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце паступова пачынае займаць належнае месца. Зараз ячэйка ТДА-Авіяхіму БДУ налічвае ў сваіх шэрагах 990 членаў. З іх па пэдфаку—386, па факультэце—206, мэдфаку—161, рабфаку—150 чал. і ў масцкоме БДУ—87 чал. Слабоў і кандыдатаў КП(б)Б і камсамольцаў—44 проц. і беспартыйных—56 проц. Трэба адзначыць, што арганізацыя ячэйкі на прынцыпу філіалаў на факультэтах і ўвядзеньне інстытуту ўпаўнаважаных па курсах сябе апраўдала. Пры ячэйцы існуюць розныя гурткі: стралкова-тактычных гурткоў—5, вайскова-хімічных—1, артылерыйскіх—1, гурткоў вайсковых ведаў паніжанага тыпу—1 і 4 хімкаманды, якія аб'яднаны ў хім'атрад. Акрамя гэтага маецца яшчэ гурток сувязі, планерны гурток і лыжная каманда.

Ва ўсіх гэтых гурткох ужо праведзены арганізацыйныя сходы і некаторыя з іх прыступілі да заняткаў. Кіраўнікамі гурткоў зьяўляюцца вайсковыя спэцыялісты і навуковыя працаўнікі. Для практычнай працы гэтыя гурткі прымацаваны да габінэтаў і вайсковых часьцей.

Ячэйкай было шмат зроблена ў адносінах ваенізацыі насельніцтва падшэфных сельсаветаў: арганізаваны ячэйкі ТДА-Авіяхіму ў сельсаветах Сеніцкім і Надгайскім, Самахвалавіцкага раёну. Акрамя гэтага ў Надгайскім сельсавеце арганізаваны стралковы і санітарны гурткі, а ў Сеніцкім—стралковы гурток. Вясной ячэйкай былі закладзены ў падшэфным Сеніцкім сельсавеце 11 вопытна-паказальных вучасткаў.

М. А.

Апавяшчэньні.

— Пры Агітпропгабінэце пачата дзяржурства кансультантаў на прадметах: ПА ПАЛІТЭКАНОМІІ—тав. Аур'е—штотыдзень па суботах ад 7 да 8 гадз. увечары; ПА МЭТОДЫЦЫ САМААДУКАЦЫІ—т. Гольдзін—штотыдзень па суботах ад 8 да 10 гадз. увечары; ПА ГІСТОРЫІ ЗАХАДУ—т. Воранаў—штотыдзень па чацьвергах ад 6 да 8 гадз. увечары.

ПЭДГАБІНЭТ.

У панядзелак, 19-12, а 7 гадз. адбудзецца пасяджэньне мэтадычнае камісіі.

У парадку дня—даклад аб прычынах другагодніцтва і аб мерах да зьмяншэньня яго (дакл. т. т. Берлін і Афонская).

Запрашаюцца ўсе загадчыкі самігадовых школ. Пажадана прысутнасьць настаўнікаў.

Н. П.

Журналізм, як навука.

Ці можна лічыць журналізм навукай і калі можна, дык якія тэарэтычныя падставы гэтай навукі? Даклад т. П. А. Карыхалава, прачытаны 12 сьнежня на першым пасяджэньні сэкцыі журналістыкі і газэтазнаўства ў Ленінградзкім навукова-дасьледчым інстытуце кнігазнаўства, быў прысьвечаны высьвятленьню гэтага пытаньня.

Водгук думкі дакладчыка, вынаходка ратацыйнай машыны, якая зьяўляецца рэвалюцыяй ў тэхніцы друкарскай справы і ўздымае яе на вышэйшую ступень, нямінуча павінна была падштурхнуць за сабой на гэту ступень і навукі пра людзкога апарату газэтнай справы. Навука аб журналізьме, спачатку, у выглядзе журналістскай адукацыі, узьнікла непасрэдна пасьля вынаходкі ратацыйнай машыны, зьяўляючыся спробай абгрунтаваць спосабы і мэтады газэтнай працы і ўстанавіць заканамернасьць у разьвіцьці газэтных жанраў і форм.

Вызначаючы газэту і часопіс, як сродак і вынік грамадзкага ўзаемадзеяньня, як матар'ялізаваны грамадзкі вопыт, ідэалёгію і псыхалёгію багучага дню, тыдню, месяцу або году, а журналізм, як навуковую дысцыпліну, вывучаючую газэту і часопіс і газэтна-часопісную справу ў іх сацыяльнай сутнасьці,—дакладчык хацеў намаляваць схему іх вывучэньня. Аднак, бытаніна і ненавуковасьць сучаснай газэтнай тэрміналёгіі, адсутнасьць навукова абмаляваных фактаў (мы зараз маем толькі асобныя цэгліны, кавалкі рознай якасьці для пабудовы навуковай дысцыпліны журналізму)—усё гэта ў значнай меры робіць больш цяжкай задачу вызначэньня навуковай тэрміналёгіі і схемы вывучэньня друку. Тэарэтычныя доводы дакладчыка зьяўляюцца арыгінальнай спробаю вызначыць шляхі ў распрацоўцы праблем журналізму. Гэта распрацоўка вымагае падрабязнай навукова-абмалёўваючай працы, якая дасьць матар'ял для стварэньня «навукі аб газэце». Грунтоўны вывад дакладчыка: «У сучасны момант журналізм мае ўсе падставы стаць навукаю».

Н. П.

ДА ВЕДАМА УСІХ ПАДПІСЧЫКАЎ

КАНТОРА

газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

гэтым апавяшчае, што апублікаваная ў №№ 278, 279, 280, 281, 282 і 283 нашай газэты

падпісная плата на газэту на 1928 год

ня мае моцы

Новая падпісная плата публікуецца ў газэце, пачынаючы з 284 нумару.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПА ДАКЛАДУ АРБІТРАЖНАЙ КАМІСІІ.

Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Зьвярнуць увагу дзяржаўных органаў на патрэбу самым уважлівым чынам адносіцца да дагавораў і ўгод, якія заключаюцца імі, як з боку поўнай і яснай фармуліроўкі дагаворных умоў, так і з боку дакладнага і своечасага выкананьня прынятых на сябе абавязанасьцяў. У паасобку, у дагаворах куплі-продажу і дастаўкі тавараў трэба ўстанаўліць парадак прыманьня-здачы тавараў і ўмовы адказнасьці за недастачу іх.

2. Зьвярнуць увагу бюджэтных установ на недапушчальнасьць закупкі матар'ялаў і тавараў і вядзеньня работ на суму большую, як гэта прадугледжана каштарысам; асоб, якія парушаюць бюджэтную дысцыпліну, прыцягваць да дысцыплінарнай адказнасьці.

3. Абавязаць дзяржаўныя органы ўжыць заходы да неадкладнай ліквідацыі свае заўнавачанасьці і на будучы час разрахоўваць памяк сабою акуратна, а калі будуць спрэчкі, не затрымваць наданьня сваіх пратэзій да спагнаньня.

4. Абавязаць установы выконваць своячасна пастановы Арбітражнай Камісіі, не даводзячы да ўжываньня захадаў прымусовага спагнаньня.

5. Да падачы пратэзіі ў Арбітражную Камісію кіраўнікі ўстаноў і прадпрыёмстваў павінны рабіць папярэднія перавяркі і адказваць старанаю для ўзаемнага нагадваньня.

6. Запрапанаваць дзяржаўным органам не падаваць у Арбітражную Камісію іскаў на суму да 100 рублёў уключна, апроч спрэчак прынцыповага значэньня, і свае пратэзіі рэгуляваць праз узаемныя перамаўленьні і згоды.

7. Дзяржаўныя органы, прыцягнутыя да адказу, павінны своячасна выконваць патрабаваньні Арбітражнай Камісіі аб тлумачэньняў на сутнасьці паданых тэзій; пры невыкананьні гэтага патрабаваньня ў тэрмін бяз уважлівых прычын Арбітражная Камісія мае права выраз спрэчку на падставе даных, паданых ісцом.

8. Дзяржаўныя органы падаючы іскі даючы адказы на іх, павінны дакладна грунтоўваць свае пратэзіі або адказы адначасовым паданьнем арыгіналаў і мантаў для пацьверджаньня пратэзіі і адказ аў на іх; для зьнішчэньня вала Арбітражная Камісія мае права, калі і заслугоўваючых увагі прычын, пакі без здаваленьня хадайніцтва старон адкідзе справы да атрыманьня дадатк матар'ялаў.

9. Запрапанаваць дзяржаўным орга калі яны лічаць патрэбным камандзіраў свайго прадстаўніка ў Арбітражную К сію для абароны іх інтарэсаў, камандз ваць асоб знаёмых з справаю ня толь юрыдычнага боку, але і з гаспадарчага.

10. Прызнаць мэтазгодным дазволіць гляд самых простых маемасных спр адным—Старшынёй Арбітражнай Ка яго намесьнікам або назначаным Стар нёю членам Арбітражнай Камісіі. Пыт не аб выраішаньні тых ці іншых спраў ною асобаю вырашаецца на распрад пасяджэньні Арбітражнай Камісіі.

11. Пункт 10 гэтай пастановы падаць зацьверджаньне Савету Народных Камісараў і Цэнтральнага Выканаўчага Камі БССР.

Старшыня Эканамічнай Нарады пры СНК БССР М. Карпі

Намесьнік Кіраўніка Спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР В. Крывіц

29 лістапада 1927 году.
г. Менск.

Постановление Экономического Совещания при Совете Нар. Комиссаров БССР

ПО ДОКЛАДУ АРБИТРАЖНОЙ КОМИССИИ.

Экономическое Совещание при СНК БССР постановляет:

1. Обратить внимание госорганов на необходимость самого серьезного отношения к заключаемым договорам и сделкам, как в отношении полной и четкой формулировки договорных условий, так и точного и своевременного выполнения принятых на себя обязательств. В частности, в договорах купли-продажи и поставки товаров необходимо устанавливать порядок приема-сдачи товаров и условия ответственности за недостачу их.

2. Обратить внимание учреждений, содержащихся на бюджете, на недопустимость закупки материалов и товаров и производства работ свыше предусмотренных сметами сумм; лиц, виновных в нарушении бюджетной дисциплины, привлекать к дисциплинарной ответственности.

3. Обязать госорганы принять меры к немедленной ликвидации своей задолженности и впредь производить взаимные расчеты аккуратно, а в случае спора не затягивать пред'явления своих претензий ко взысканию.

4. Обязать учреждения выполнять своевременно решения Арбитражной Комиссии, не доводя до принятия мер принудительного взыскания.

5. До пред'явления претензии в Арбитражную Комиссию руководители учреждений и предприятий обязаны входить в предварительные переговоры с ответной стороной в целях взаимного улажения спора.

6. Предложить госорганам не пред'являть в Арбитражную Комиссию исков на сумму до 100 рублей включительно, кроме споров принципиального значения, и свои претензии регулировать путем взаимных переговоров и соглашений.

7. Госорганы, привлеченные к ответу, должны выполнять своевременно требования Арбитражной Комиссии о даче объяснений по существу пред'явленных претензий; при невыполнении этого требования в срок без уважительных для этого причин Арбитражная Комиссия вправе разрешить спор на основании представленных материалов.

8. При пред'явлении исков и даче отражений по ним, госорганы обязаны представлять полное обоснование своих претензий или возражений с одновременным представлением подлинных документов и в утверждение претензии или возражения; в целях устранения волокиты Арбитражная Комиссия вправе, при отсутствии особо уважительных причин, оставлять без удовлетворения ходатайства сторон об отложении дела до получения добавочных материалов.

8. Предложить госорганам в случае признания ими необходимости командировать своего представителя в Арбитражную Комиссию для защиты их интересов, командировать лиц знакомых с делом не только с юридической стороны, но и с хозяйственной.

10. Признать целесообразным допустить рассмотрение простейших имущественных споров единолично Председателем Арбитражной Комиссии, его заместителем и членом Арбитражной Комиссии по назначению Председателя. Вопрос о единоличном разрешении тех или иных дел решается распорядительном заседании Арбитражной Комиссии.

11. Пункт 10 настоящего постановления внести на утверждение СНК и ЦИК БССР.

Председатель Экономического Совещания при СНК БССР М. Карпинский

Зам. Управляющего Делами СНК и Экономического Совещания БССР Крывицкий

29 ноября 1927 г.
г. Минск.

Папраўкі.

У ўчарашным нумары нашай газэты ў артыкуле „Па чатырох краінах" З. Жылуновіча карэктурай дапушчаны шэраг грубых абмылак. У першым слупку, у першым радку надрукавана салідарнага воргану, а трэба салідзнага воргану; у трэцім слупку, 4 радок зьверху—надрукавана „Slovansky Przexled", а трэба „Slovansky Pžehled"; гэта-ж назва крыху ніжэй надрукавана „Slovansky Pzegled" У шостым слупку, радок 14 надрукавана (fior o klck), а трэба (Five o clock).

У артыкуле „Трэба перабудаваць шэрагі юстыцы" („Сав. Беларусь" № 285) ёсьць даволі нянрыемныя памылкі, а імянна:

Надрукавана:... „рэвалюцыйная і сацыялістычная сьвядомасьць права..."

А трэба: „рэвалюцыйная і сацыялістычная правасьвядомасьць".

Надрукавана:... „пакольні голас суровых прысудаў рэвалюцыйных трыбуналаў..."

А трэба: „пастольні..."

Надрукавана:... „супярэчаныя духу савецкага будаўніцтва, на падставе ўцягваньня ў кіраўніцтва дзяржаваю шырокіх працоўных мас, адналі самі па сабе..."

А трэба: „...супярэчаныя духу савецкага будаўніцтва, на падставе ўцягваньня ў кіраўніцтва дзяржаваю шырокіх працоўных мас, адналі самі па сабе..."

Надрукавана: „... НКЮ выканаў сваю справу і ён будзе адзначан у гісторыі".

А трэба: „НКЮ выканаў сваю справу ён ідзе ў гісторыю".

Надрукавана: „... у працы па кіраўніцтву практыкаў".

А трэба: „у працы па кіраўніцтву практыкай".

Надрукавана „... з дзяржаўнай арганізацыі абарона ў будучыне зробіцца трыбуналам у нашым судзе..."

А трэба: „...з дзяржаўнай арганізацыі абарона ў будучыне зробіцца трыбуналам нашым судзе..."

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
Субота, 17 лістапада.
„ЦАР МАКСІМІЛЬЯН" для ЛКСМБ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — Грандыёзны маст. фільм „МАСКА СОРВАНА" („ТЕНИ БЕЛЬВЕДЕРА"). Драма ў 7 часьцях.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — З аўторка, 12 сьнежня, Сусьветны фільм „ПАРИЖАНКА". Маст. драма ў 8 часьцях. Каса адчынена з 6 гадзін вечара.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — „ЧЕРНЫЙ КОНВЕРТ". У 2-х сэрыях, 13 часьцах